КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №45 (173)
◂ 4 СНЕЖНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**АЛЕНА МАКОЎСКАЯ**

Стар. 4

**АЛЬТЭРНАТЫВА БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ**

У Беларусі, па інфармацыі Мінабароны, штогод выяўляецца сем-восем чалавек, якія не хочуць браць у рукі зброю

Стар. 6

**РЭФЕРЭНДУМ НА АНДРЭЯ**

30 лістапада 2010 года ў Дзень Святога Андрэя можа пачацца працэс выхаду Шатландыі са складу Вялікабрытаніі

Стар. 12

**МАРМАЗЯЎР СУПРАЦЬ ЖАБАВОКА**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**СУЧАСНАЕ БЕЛАРУСКАЕ СЯРЭДНЯВЕЧЧА**

Артыкул Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ З НАГОДЫ

# МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ ПА НОВЫМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ

Вольга ХВОІН

**Улады Беларусі вырашылі прадэманстраваць Захаду імгненную гатоўнасць да дэмакратыі. У першым чытанні 104 дэпутаты Палаты прадстаўнікоў аднагалосна выказаліся за ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у выбарчае заканадаўства Беларусі.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

130 паправак у 45-ці артыкулах Выбарчага кодэкса закранаюць працэдуру выбараў ад фарміравання выбарчых камісій да вылучэння кандыдатаў. Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай, выбарчыя камісіі атрымаюць больш незалежнасці ад органаў улады. У прыватнасці, прапануецца забараніць мясцовым выканаўчым і распарадчым органам улады ўключаць сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій. Чыноўнікі могуць складаць не больш адной трэціны выбарчай камісіі, 30 працэнтаў сябраў выбарчай камісіі абавязкова павінны быць з палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

Лідзія Ярмошына адзначыла, што «істотны аб'ёмны блок» паправак закранае спрашчэнне парадку вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты і прэзідэнты. Па яе словах, за апошнія гады значна скарацілася колькасць прэтэндэнтаў, якіх вылучаюць ад партый: у параўнанні з парламенцкімі выбарамі 2004-га і 2008 гадоў іх стала ў 6 раз менш. Таму плануецца спрасціць збор подпісаў, дазволіць вылучэнне кандыдатаў па ўсіх акругах, незалежна ад наяўнасці там структуры партыі. Збор подпісаў можна будзе ажыццяўляць у выглядзе пікету і без дазволу на гэта мясцовых уладаў. «Напярэдадні выбарчай кампаніі мясцовыя ўлады вызначаць месцы, дзе нельга будзе праводзіць пікеты», — паведаміла старшыня ЦВК. У астатніх месцах збіраць подпісы будзе дазволена.

Спросціць жыццё кандыдатам у дэпутаты і прэзідэнты норма пра тое, што яны не нясуць адказнасць за забеспячэнне грамадскага парадку на перадвыбарчых мерапрыемствах. Упершыню ў Беларусі кандыдатам у дэпутаты і прэзідэнты дазволяць фармаваць асабістыя выбарчыя фонды. Сродкі можна будзе накіроўваць на фінансаванне агітацыі. Для кандыдатаў у прэзідэнты вызначана мяжа агульнага аб'ёму фонду да 3 тысяч базавых велічынь (цяпер гэта 105 мільёнаў рублёў), для кандыдатаў у дэпутаты — 1 тысяча базавых велічынь (35 мільёнаў рублёў). Пералічваць сродкі ў фонды могуць толькі грамадзяне і юрыдычныя асобы Беларусі. Фінансавая дапамога з-за мяжы забаронена.

Прапануецца таксама змяніць падставы для адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў. У прыватнасці, памылкі ў біяграфічных звестках не будуць з'яўляцца падставай для адмовы. А памылкі ў дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці могуць быць падставай для адмовы толькі ў выпадку, калі носяць істотны характар і інфармацыя была ўтоена наўмысна.

Лідзія Ярмошына лічыць, што «патрабаванні Еўрасаюза і АБСЕ максімальна ўлічаныя — на 85–90 працэнтаў». Аднак у Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ папраўкі ў Выбарчы кодэкс пакуль не накіраваныя, і зваротнага каментару на конт мяркуемых навацыяў не было. Чакаецца, што ў другім чытанні законапраект будзе разгледжаны Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу 10 снежня.

Нягледзячы на шэраг палёгкаў, у выбарчае заканадаўства так і не былі ўнесеныя змены, якія датычацца найперш адкрытага падліку галасоў для назіральнікаў. Ва ўмовах Беларусі гэта азначае, што на папярэдніх этапах бліжэйшых выбарчых кампаніях будзе мець месца пэўны лібералізм, але выніковыя і галоўныя працэдуры па-ранейшаму застануцца закрытымі для кантролю.

На хвалі дыялогу з Захадам бліжэйшая выбарчая кампанія ў мясцовыя саветы хутчэй за ўсё пройдзе адносна ліберальна. Аднак трэба ўлічваць, што ў апазіцыі наўрад ці хопіць рэсурсу, каб ахапіць усе выбарчыя акругі — праца, як звычайна, будзе кропкавай, і прарыву чакаць не варта. Еўропа, якая надзвычай зацікаўлена ў развіцці адносінаў з Беларуссю, прыме вынікі выбараў нават з парушэннямі, як тое было пасля апошняй парламенцкай кампаніі, што ў сваю чаргу будзе своеасаблівым заахвочваннем афіцыйнаму Мінску.

Зрэшты, ужо даўно бачна, што гульня ідзе па мясцовых, а не брусельскіх правілах. А апазіцыя пакрысе ўключаецца ў працэс легалізацыі ўлады. Істотны момант: каб змяніць цяперашнюю сітуацыю ў грамадска-палітычным сектары, адных паправак у выбарчае заканадаўства недастаткова. Палітычнай сістэме Беларусі гэтыя папраўкі як мёртваму прыпаркі. Але ж добра ўпісваюцца ў «павольныя крокі» насустрач дэмакратыі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЗАБІЎСЯ АБ БАРДЗЮР У ЦЭНТРЫ ГОРАДА?

**Вольга ХВОІН**

**28 лістапада ў Мар'інай Горцы пахавалі сябра партыі БНФ, распаўсюдніка незалежнай прэсы Валянціна Доўнара. Яму быў толькі 51 год. Яго смерць выклікае многа пытанняў: міліцыянты гавораць пра няшчасны выпадак, знаёмыя — пра забойства.**

Валянцін Доўнар працаваў у Мінску ў Белдзяржстраху. У пятніцу 20 лістапада, атрымаўшы заробак і чарговы нумар газеты «Новы час» для распаўсюду, ён прыехаў у Мар'іну Горку. Позна вечарам Валянціна знайшлі ў непрытомным стане з чэрапна-мазгавой траўмай на пляцоўцы побач з кінатэатрам «Кастрычнік» у цэнтры горада. Месца даволі люднае: недалёка чыгуначны вакзал, мясцовы РУУС і КДБ, у самім кінатэатры па пятніцах ладзяць дыскатэкі, тут жа месціцца папулярны бар «Тэхас». Але атрымалася, што ніхто не бачыў нападу, ніхто не звярнуў увагу на чалавека, які ляжаў на зямлі без прытомнасці. Валянціна ў прыёмны пакой мясцовай бальніцы прывезла хуткая, якую выклікалі міліцыянты.

Ужо на пахаванні стала вядома, што ўсе дакументы, грошы, торба Валянціна зніклі. Пры ім, як расказала маці, была чужая, не яго торба, у якой знаходзіліся нейкія паперы на імя Баратухі, менавіта таму ён і прабыў у бальніцы пад імем Баратухі Івана Іванавіча. Праз тыдзень Валянцін Доўнар памёр ад гематомы галаўнога мозгу, так і не апрытомеўшы. Міліцыянты лічаць, што Валянцін сам паваліўся ды ўдарыўся аб тратуарную плітку. Ці магчыма ўпасці на роўным месцы, калі няма галалёду, так, каб разбіць патыліцу да смерці? У бальніцы гаварылі, што траўма — вынік удару тупым прадметам, гумавым дручком ці яшчэ нечым цяжкім.

Закіды наконт таго, што Валянцін Доўнар быў п'яны, у адзін голас разбураюць яго знаёмыя і калегі: ён ніколі не піў — ні на святах, ні ў кампаніі. Хаця ў РУУСе гавораць, што адразу была праведзеная экспертыза, якая паказала моцны стан алкагольнага ап'янення.

«Ён быў як дарослае дзіця, — расказвае сябар Валянціна Сцяпан Кульчанка. — Такога нават у думках не хочацца крыўдзіць, не тое што на справе». Уласнай сям'і Валянцін не меў, у яго былі толькі маці і брат. Застаўся недабудаваны дабротны дом у Мар'інай Горцы, пакоі якога застаўленыя хатнімі кветкамі (захапленне Валянціна), а па падворку бегаюць цяпер ужо нічыйныя самотныя коткі.

На пахаванні былі тыя, хто добра ведаў Валянціна. Прыехаў і выключаны з партыі БНФ Алесь Міхалевіч. Чаго не скажаш пра мінскае кіраўніцтва партыі. З іх не было нікога, хаця Валянцін Доўнар ужо шмат гадоў у БНФ. Варта аддаць належнае калегам Валянціна па Белдзяржстраху — з Мінску правесці ў апошні шлях чалавека прыехалі больш за дваццаць чалавек.

Крымінальная справа па факце гібелі Валянціна Доўнара пакуль не заведзеная. Кіраўнік крымінальнага вышуку Мар'інай Горкі Яўген Кульбіцкі паведаміў, што міліцыя правяла праверку і накіравала ў пракуратуру «адказны матэрыял», то бок не знайшла падстаў для завядзення крымінальнай справы. «Магчыма, яго асабістыя рэчы і скралі, а магчыма ён іх сам згубіў, — заявіў Кульбіцкі. — Але крыміналу ў здарэнні няма. Доўнар сам упаў і разбіў галаву аб бардзюр».

КАМПАНІЯ

# УЛАДЫ АТАКУЮЦЬ БХД

**Генадзь КЕСНЕР**

**За апошнія два месяцы многія заснавальнікі Партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», дакументы на рэгістрацыю якой пададзены ў Міністэрства юстыцыі, сталі ахвярамі беспрэцэдэнтнай кампаніі запалохвання і дыскрэдытацыі.**




Фота Юрыя Дзядзінкіна

Пра гэта 2 снежня на адмысловай сустрэчы з журналістамі казалі сустаршыні БХД і актывісты арганізацыі, якія на ўласным досведзе зведалі ўціск як з боку спецслужб, так і працадаўцаў.

«Шырокамаштабныя дзеянні і Міністэрства юстыцыі, і Камітэта дзяржаўнай бяспекі, і аддзелаў па ідэалогіі выканкамаў, і іншых спецслужбаў, да якіх я залічваю і Беларускае тэлебачанне, іншыя дзяржаўныя тэлеканалы, сведчаць пра тое, што ёсць спецыяльная дзяржаўная замова на БХД, і апошнія два месяцы ўлада сваімі рэпрэсіўнымі і абсалютна антызаконнымі дзеяннямі рыхтуе нерэгістрацыю», — адзначыў сустаршыня арганізацыі Аляксей Шэін.

Па словах Віталя Рымашэўскага, асноўнымі «ахвярамі» кампаніі пераследу сталі менавіта тыя людзі, што сталі заснавальнікамі «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі», паставілі свае подпісы пад адпаведнымі дакументамі. Многіх падпісантаў выклікаюць у ідэалагічныя аддзелы і патрабуюць ад іх адклікаць свае подпісы або падпісаць заявы, што яны насамрэч не падпісвалі дакументы аб заснаванні БХД. Пры гэтым актывістам БХД пагражаюць звальненнямі, выключэннямі з навучальных устаноў альбо непрацягам працоўнага кантракту, як тое здарылася з актывісткай БХД з Баранавіч Галінай Ярашэвіч.

Адным з моцных удараў па партыі зрабілася з'яўленне на форуме аднаго з найбуйнейшых беларускіх інтэрнэт-парталаў кампрамату на сустаршыню БХД, бацьку пяці дзяцей Георгія Дзмітрука, пры падрыхтоўцы чаго былі скарыстаны сучасныя тэхнічныя сродкі. Сам Дзмітрук ужо падаў у пракуратуру заяву з патрабаваннем адрэагаваць на з'яўленне абразлівага матэр'ялу і прыцягнуць аўтара кампрамату да адказнасці.

Дзяржаўныя СМІ вядуць кампанію ачарнення і паклёпу на кіраўнікоў і актывістаў БХД, і часта гэта ўяўляе сур'ёзную небяспеку. «Мы памятаем, што пасля нядаўняга сюжэта па Беларускім тэлебачанні, у якім было выліта шмат бруду на БХД і аднаго з яе заснавальнікаў Паўла Севярынца, у яго бацькі Кастуся Севярынца здарыўся інфаркт», — нагадаў Віталь Рымашэўскі.

Варта адзначыць, што зараз у судзе Першамайскага раёна Мінска знаходзіцца заява ад узбуджэнні супраць БТ справы аб абароне гонару і годнасці абражаных у той праграме актывістаў «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі» і самой арганізацыі ў цэлым.

ПАЗІЦЫЯ

# ЗА НАШЫ ГРОШЫ

**«Падтрымліваць расійскі аўтапрам за грошы беларусаў — цынічна», — лічыць лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.**

«Улада кажа, што трэба паставіць заслон старым машынам, каб Беларусь не стала звалкай старых аўтамабіляў. Але чамусьці ў нас ніхто добраахвотна не адмаўляецца ад еўрапейскага «хламу», на карысць новай прадукцыі АўтаВАЗу. Мыты вельмі завышаныя і на новыя аўтамабілі. У некаторых выпадках мыта падвысіцца амаль у 10 разоў. Гэта выкрывае сапраўдную мэту новай мытнай палітыкі — абарону расійскіх вытворцаў легкавых аўтамабіляў. Згода беларускіх уладаў на новыя мыты дэманструе цынічнае стаўленне да інтарэсаў сваіх грамадзян», — падкрэслівае Аляксандр Мілінкевіч.

На думку лідэра Руху «За Свабоду», аўтамабіль, які даўно ператварыўся з раскошы ў штодзённую неабходнасць, стане менш даступным. Беларусам прапануюць купляць менш якасныя, не сучасныя і дастаткова дарагія расійскія машыны. Беларуская прамысловасць не атрымае ад гэтага ніякіх выгод.

«Калі б у Беларусі былі нармальныя і паслядоўныя адносіны з краінамі Еўрасаюза, дык у нашай краіне даўно была распачата зборка папулярных мадэляў аўтамабіляў, а мыта на новыя еўрапейскія аўтамабілі была б вельмі нізкай», — падсумоўвае Аляксандр Мілінкевіч.

**Прэс-служба Руху «За Свабоду»**

СМІ

# СУСВЕТНЫ ФОРУМ РЭДАКТАРАЎ

**1 снежня ў Хайдарабадзе (Індыя) адбылося афіцыйнае адкрыццё 62-га Сусветнага кангрэса газет і 16-га Сусветнага форума рэдактараў. З вітальнай прамовай на цырымоніі адкрыцця выступіла прэзідэнт Індыі Працібха Паціл.**




У форуме, які штогод праводзіцца Сусветнай асацыяцыяй газет (WAN-IFRA), удзельнічае каля 1000 рэдактараў і выдаўцоў з 87 краін, у тым ліку з Беларусі — рэдактар газеты «Новы Час» Аляксей Кароль і рэдактар мультымедыйнага часопіса «34mag.net» Ірына Віданава.

Традыцыйна на цырымоніі адкрыцця форума ўручаецца ўзнагарода «Залатая асадка свабоды» ў знак салідарнасці з журналістамі і рэдактарамі, якія пераследуюцца за свае перакананні і выкананне прафесійнага абавязку. Лаўрэатам 2009 года стаў рэдактар пакістанскіх газет «Friday Times» і «Daily Times» Найям Сетхі. У 2003 годзе «Залатую асадку свабоды» атрымала Беларуская асацыяцыя журналістаў.

Праграма форума сканцэнтравана на дзвюх асноўных тэмах: свабода слова і развіццё СМІ ва ўмовах фінансавага крызісу. Быў прадстаўлены даклад пра сусветныя тэндэнцыі развіцця газетнай індустрыі. Абмяркоўваліся пытанні будучыні журналістыкі, зместу і формы выданняў, спалучэння друкаваных і мультымедыйных платформ, а таксама бізнес-мадэлі для далейшага развіцця СМІ.

Удзельнікі форума прыйшлі да агульнай высновы, што асноўным інструментам пераадолення адмоўнага ўплыву фінансавага крызісу на газетную індустрыю з'яўляецца якасная журналістыка, якая дапаможа ўтрымаць і пашырыць чытацкую аўдыторыю, і такім чынам павялічыць наклады выданняў.

Сімвалічна, што форум адбываецца ў Індыі — другім па памеры медыйным рынку ў свеце (пасля Кітая), дзе, нягледзячы на крызіс, назіраецца інтэнсіўны рост як друкаваных, так і электронных СМІ. Форум працягне працу да 4 снежня.

ГРОШЫ

# ПЕНСІІ ПАМЕНШЫЛІСЯ

**Мінпрацы апублікаваў дадзеныя аб памерах пенсій за лістапад. Як вядома, менавіта з гэтага месяца ў краіне былі падвышаны працоўныя пенсіі ў сярэднім на 9,5 працэнта.**

У прыватнасці, сярэдняя працоўная пенсія па ўзросту ў намінале павялічылася на 9,7 працэнта (з 409652 рублёў у кастрычніку да 449361 рублёў у лістападзе). Нядрэнны дадатак, здаецца, але толькі калі не прымаць да ўвагі інфляцыю. Паколькі папярэдняе падвышэнне пенсій было праведзена ажно ў жніўні мінулага года, а рост коштаў са жніўня па кастрычнік, нават па афіцыйных дадзеных, склаў 13,4 працэнта, то гэта азначае, што пенсіянеры нават пасля падвышэння сталі жыць горш, чым у жніўні мінулага года на 3,3%.

Лістападаўскае падвышэнне не кампенсавала пенсіянерам інфляцыйных стратаў. Да таго ж, наколькі вядома, хуткім часам яшчэ аднаго падвышэння пенсій не чакаецца, а інфляцыя збірае сваё жніво штомесяц, такім чынам, ужо да Новага года пенсіянеры зноў застануцца ні з чым.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НОВЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСІ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Ёсць такая гісторыя. Задумаў неяк Паскробышаў (персанальны рэферэнт Сталіна) «падсядзець» тады яшчэ не маршала, але кіраўніка фронтам Ракасоўскага. І прыйшоў да Сталіна, маўляў Ракасоўскі маральна разбэшчваецца, ніводнай спадніцы не прапускае, пры жывой жонцы ў яго ў палюбоўніцах Любоў Арлова, але і ёй ён здраджвае з любымі сувязісткамі-тэлеграфісткамі. «А як справы на фронце ў таварыша Ракасоўскага?», — запытаўся Сталін. Абмеркаванне пераключылася на тое, што на фронце ў Ракасоўскага ўсё добра. Ужо сыходзячы, Паскробышаў запытаўся ў Сталіна: «Так што ж мы будзем рабіць з Ракасоўскім?» «Зайздросціць», — адказаў Іосіф Вісарыёнавіч.**



Photo.ByMedia.Net

Гэта гісторыя цалкам пасуе да сітуацыі, якая здарылася з адным з сузаснавальнікаў партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Георгіем Дзмітруком. 1 снежня аўдыёзапісы, што тычацца Дзмітрука, з'явіліся на адным з форумаў на партале *tut.by* і разасланыя большасці інфармацыйных рэсурсаў. «Прадстаўніцы старадаўняй прафесіі Оля, Лена і Юля» абвінавацілі Дзмітрука ў запазычанасці за «паслугі».

«Я звярнуўся ў пракуратуру Кобрына з просьбай даць прававую ацэнку дзеянням інтэрнэт-рэсурсу *tut.by*, на форуме якога былі апублікаваныя гэтыя запісы. Апрача таго, я звярнуўся да адміністратараў партала з тым, каб яны выдалілі гэты форум. Да гонару рэсурсу *tut.by*, форум быў выдалены на працягу дзвюх гадзін. Апрача таго, я звярнуўся да адміністрацыі партала *mail.ru*, з якога ішла рассылка паклёпніцкіх матэрыялаў, з просьбай заблакіраваць адрас, з якога гэтыя матэрыялы рассылаліся. Адказу я пакуль не атрымаў», — сказаў Дзмітрук.

Паводле яго слоў, у яго ўжо ёсць дамоўленасць з незалежнымі экспертамі наконт правядзення аналізу аўдыёзапісу. «Я ведаю, што з дапамогай тэхнічных сродкаў можна зрабіць які заўгодна мантаж. Але з дапамогай тых жа сродкаў можна ўстанавіць і факт мантажу. Менавіта гэта я і збіраюся зрабіць. Я не сумняваюся, што нам удасца даказаць мантаж», — зазначыў Георгій.

Навошта нешта даказваць? Гэта ж суцэльны пазітыўны піяр у дачыненні да Дзмітрука ў прыватнасці і да БХД цалкам!

Дзмітруку — больш за 40 гадоў. У яго ёсць жонка і пяцёра дзяцей. А што такое пяцёра дзяцей, разумее кожны, хто мае хоць аднаго. Першага пасадзі на гаршчок, у другога правер дзённік, трэцяму дапамажы задачку па матэматыцы рашыць, чацвёртага пакармі, пятаму памперсы памяняй, а гэтым часам першы ўжо гуляцца хоча, дый гаршчок трэба вынесці. Жонку трэба ўлагодзіць, і пры гэтым Дзмітрук яшчэ бавіць час з трыма путанамі разам і адначасова? Гэта ж якое здароўе трэба мецы! Сапраўды, як казаў таварыш Сталін, якога так не любіць БХД: «Зайздросціць трэба, таварыш Паскробышаў!»

Дзмітрук — гэта новы секс-сімвал Беларусі для ўсіх беларускіх дзяўчатак. Славамір Адамовіч і Адам Глобус, якія ў сваіх творах выхваляліся ўласнымі амурнымі прыгодамі, нервова паляць убаку. Да іх далучаецца вядомы лавелас Сільвіа Берлусконі і кажа ім: «Аблажаліся мы, пацаны...»

Дарэчы, пра Берлусконі. Здавалася б, з часоў Біла Клінтана гэта быў першы візіт у Беларусь палітыка такога ўзроўню. Гэта ж не кіраўнік дзяржавы «трэцяга свету» і не прэзідэнт адной з краінаў СНД. Гэта кіраўнік не апошняй дзяржавы ў Еўрасаюзе! Раней беларускі МЗС на кожным скрыжаванні распавядаў бы пра «прарыў у адносінах з Еўропай». А тут узнікае ўражанне, што сябар Сільвіа прыляцеў, і нават, як кажуць, «гарбаты не папіўшы», зляцеў па сваіх справах. Дарэчы, ніхто не абмяркоўвае канкрэтныя вынікі гэтага візіту. Нібыта іх і не было. Сродкі масавай інфармацыі абмяркоўваюць сам факт візіту, і тое, што Берлусконі набыў у Мінску.

«Пасля ўскладання кветак да манумента на плошчы Перамогі, кіраўнік ураду Італьянскай Рэспублікі выраўшаў прагуляцца па нашай сталіцы. Кароткі шпацыр скончыўся ў краме «Крышталь», што на галоўным праспекце. Там уладальнік футбольнага клуба «Мілан» набыў цукерачніцу і вазу для садавіны барысаўскай вытворчасці агульным коштам больш за 800 тысяч беларускіх рублёў», — піша пра Берлусконі «Наша Ніва». Не адстае і «Камсамольская праўда» ў Беларусі», якая паведамляе пра наведванне сябрам Сільвіа крамы «Лянок».

Што можна сказаць? Пра канкрэтныя вынікі гэтага візіту ніхто не піша. Можа, Берлусконі і паставіў свой камерцыйна каштоўны подпіс пад нейкімі кантрактамі, але пра гэта ніхто ні слова не сказаў. Інфармацыя — закрытая, толькі чуткі, што Берлусконі падпісаў нейкія банкаўскія кантракты і кантракты на мадэрнізацыю ваеннай тэхнікі. Больш — нічога. Складваецца ўражанне, што спадар Сільвіа жыць не мог без беларускай цукерачніцы.

**Можа, Берлусконі і паставіў свой камерцыйна каштоўны подпіс пад нейкімі кантрактамі, але пра гэта ніхто ні слова не сказаў. Інфармацыя — закрытая, толькі чуткі**

І яшчэ адна знакавая падзея. Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым чытанні законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях правядзення выбараў і рэферэндумаў.

Законапраект змяняе парадак фарміравання выбарчых камісій. Спрашчаецца парадак вылучэння кандыдатаў, у тым ліку ад палітычных партый. А таксама парадак правядзення перадвыбарчых сустрэч з грамадзянамі ў выглядзе масавых сходаў, пікетаў. Кандыдаты маюць права праводзіць масавыя мерапрыемствы па перадвыбарчай агітацыі ў паведамляльным парадку ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах, а таксама магчымасць ажыццяўляць сумесную агітацыю. Падчас правядзення мясцовых выбараў выключаецца парог яўкі выбаршчыкаў, неабходны для прызнання таго, што выбары ў мясцовыя саветы адбыліся.

Як гэта адгукнецца — пабачым у наступным годзе.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МАКСІМ МІРНЫ



Беларускі тэнісіст Максім Мірны і ізраільскі Эндзі Рам падняліся на 5-е месца ў абноўленым рэйтынгу дуэтаў Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў (АТП) пасля выхаду ў фінал выніковага турніру года ў Лондане. 29 лістапада ў вырашальным паядынку парнага разраду выніковага турніру АТП, куды запрашаюцца восем лепшых дуэтаў свету, беларуска-ізраільскі тандэм саступіў амерыканскім братам-двайнятам Бобу і Суколку Браянам. У выніку браты Браяны падняліся ў сусветнай класіфікацыі з другога месца на першае, а дуэт Мірны/Рам з 7-га радку перамясціўся на 5-ты. У актыве Максіма Мірнага засталося 36 тытулаў, заваяваных у парных турнірах. Яшчэ 29 разоў ён дабіраўся да фіналаў. З наступнага года цяперашні напарнік Максіма Мірнага Эндзі Рам збіраецца гуляць са сваім былым партнёрам, суайчыннікам Джонатанам Эрліхам, які залечваў траўму. Разам ізраільцяне выйгралі 12 парных тытулаў. Таму Максіму Мірнаму давядзецца шукаць новага напарніка. Цяперашні рэйтынг Мірнага — лепшы пасля 26 кастрычніка. Спартовец быў лідэрам рэйтынгу ў агульнай суме 39 тыдняў — з 9 чэрвеня па 7 верасня 2003 года (13 тыдняў), з 20 кастрычніка 2003 года па 1 лютага 2004 года (15 тыдняў) і з 29 студзеня па 15 красавіка 2007 года (11 тыдняў).

Мужчынскі адзіночны рэйтынг узначальвае швейцарац Ражэ Федэрэр. Жаночы — амерыканка Серэна Вільямс, беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка знаходзіцца на сёмым месцы.



### СІРОЖКА ПІСТОНЧЫК

Сірожка Пістончык, Уласік Смаркач. Йопыты двух маладых нелюдзяў. (Серыя «Яжысьціка»). Выд-ва «Плюшч», 205 с., Тыраж — ніякой.

Самвыдатаўскую кнігу камедных прыпавесцяў — «случаі з жызьні, дзідзіцкіныя расказы, кашмарыкі і другія развлікацельныя жанры» — выпусціў у свет літаратар Сірожка Пістончык, ён жа — Сяргей Прылуцкі. Кніга пазбаўленая класічнай літаратурнай мовы і цэнзуры, затое напоўненая трасянкай, малюнкамі ад рукі і нецэнзурнымі выразамі. Панк у чыстым выглядзе.

Берасцейскі літаратар у сваім блогу піша пра сябе так: «*Мая хвіласофія праста. Порыць усім графік жыцьця. Выкідваць пабольшэ хвіньцюлей. Ня допускаць пячалі. І тады судьба ўлыбнёцца*».

Акрамя прыхільнасці да трасянкі, Сяргей Прылуцкі вядомы як удзельнік шматлікіх паэтычных фестываляў і лаўрэат літаратурных конкурсаў. Ягоныя творы друкаваліся ў зборніках і анталогіях маладой беларускай літаратуры, нядаўна была выдадзеная кніга вершаў «Дзевяностыя forever».

### МЕЧЫСЛАЎ ГРЫБ



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Прэзідыум палітрады Аб'яднаных дэмакратычных сіл вылучыў для ўдзелу ў праймерыз адзінага кандыдата ў прэзідэнты на бліжэйшую выбарчую кампанію былога спікера Вярхоўнага Савета 12 склікання, генеральнага сакратара Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Мечыслава Грыба. «Партыя вырашыла, а я пагадзіўся. Паспрабую сябе ў новай якасці, — заявіў палітык у інтэрв'ю «Радыё Свабода». — Што да праграмы, безумоўна, буду абапірацца на праграму партыі, але, па вялікім рахунку, лічу гэта не галоўным. Вось абіралі прэзідэнта Еўрасаюза, і ён сказаў, што для яго галоўная праграма — гэта ўладкоўваць адносіны паміж краінамі ў Еўропе. У нас, лічу, галоўнае — уладкаваць адносіны паміж людзьмі, паміж партыямі, паміж палітычнымі групамі ўнутры краіны». Праймерыз можа адбыцца ўжо ў студзені або цягам трох першых месяцаў новага года. Верагоднае месца правядзення тэставага галасавання — Аршанскі раён Віцебскай вобласці.

Падчас выбарчай кампаніі 2001 года Мечыслаў Грыб удзельнічаў у незалежным назіранні, у 2006-м — узначальваў штаб кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна.

▸ ТРЭЦІ СЕКТАР

# АЛЕНА МАКОЎСКАЯ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Калі газета «Ніша Ніва» назвала Алену Макоўскую сярод дзесяці самых сексуальных беларускамоўных жанчын, то цалкам мела рацыю. Я б толькі дадаў — не толькі беларускамоўных. Але наша гутарка зусім не «пра гэта». Алену Макоўскую больш ведаць як аднаго з найбольш яскравых дзеячаў трэцяга сектара. І не толькі таму, што яна ўзначаліла Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

## Усе мы родам з дзяцінства

Калі бачыш гэту прыгожую жанчыну, то менш за ўсё думаеш пра ўзрост, але законы жанру прымушаюць пачаць менавіта з гэтага. Алена Макоўская нарадзілася 1 ліпеня 1970 года ў Кобрыне. Там жа пайшла ў сярэднюю школу № 6 з англамоўным ухілам. Таму зразумела, што пасля заканчэння школы ў 1987 годзе Алена пайшла паступаць у Інстытут замежных моваў (тады ён яшчэ не быў Лінгвістычным універсітэтам). І, натуральна, паступіла.

Дарэчы, у школьныя і інстытуцкія гады ў Макоўскай не было ніякага імкнення да грамадскай працы. Наадварот. Пры выдатнай вучобе яна заўжды заставалася ў ценю. Але гэта быў іншы час. Тады панавала зусім іншая ідэалогія. Савецкая. З усімі наступствамі...

Бацькі (на жаль, іх ужо няма) ставіліся да таго, што дачка пачала займацца грамадскай дзейнасцю ў розныя часы па-рознаму. Да 1997 года цалкам падтрымлівалі, а калі стала зразумела, што пры новай уладзе гэта робіцца небяспечнай справай, нават раілі змяніць працу.

Бацька, Павал Яфімавіч, доўгі час быў намеснікам дырэктара кансервавага заводу. А маці, Ларыса Германаўна, працавала ў дзіцячай бібліятэцы. Яна не была беларускамоўнай. Больш за тое, нарадзілася ва Украіне. Калі ехалі да ўкраінскай бабулі і перасякалі мяжу, то яна адразу пачынала размаўляць па-ўкраінску.

Можа менавіта гэта і будзе потым асновай таго, што Алена Макоўская стане адным з галоўных у краіне аматараў усяго роднага.

## З чаго пачалася «Бацькаўшчына»

У Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» Макоўская трапіла амаль выпадкова. Пасля заканчэння ў 1992 годзе Інстытута замежных моваў па абвестцы ў газеце яна прыйшла сюды працаваць на пасаду сакратара-рэферэнта.

«Бацькаўшчыну» заснавалі ў 1990 годзе, а зарэгістравалі ў 1991-м. Прэзідэнтам (тады яшчэ так называць было можна) арганізацыі быў Васіль Быкаў, а Радай кіраваў Яўген Лецка. У 1993 годзе адбыўся першы з'езд беларусаў свету. Адпаведна, змянілася і кіраўніцтва. Прэзідэнтам абралі акадэміка Радзіма Гарэцкага, а старшынёй Рады стала Ганна Сурмач.

Алена Макоўская працавала сакратаром-рэферэнтам да 1994 года, калі пры «Бацькаўшчыне» (па рашэнню першага з'езда) было створана прадпрыемства, якое працавала сумесна з прадпрымальнікамі з беларускай дыяспары і накіроўвала пэўны прыбытак ад сваёй дзейнасці на патрэбы гэтай грамадскай структуры. Усё было непарыўна звязана, але камерцыйная структура дазваляла рабіць тое, што не магла грамадская — зарабляць грошы. Займалася гандлем, прадуктамі харчавання, лесам, высокімі тэхналогіямі і г.д.

Праіснавала прадпрыемства толькі тры гады. Яго закрылі, каб выратаваць саму «Бацькаўшчыну». І гэта можа быць даволі красамоўным адказам тым, хто распавядае пра нейкія прывабныя якасці бізнесу па-беларуску. Калі памяць не здраджвае, тады таксама здарыўся крызіс, расійскі дэфолт.

Быў і яшчэ адзін момант, які не мог паспрыяць нармальнай камерцыйнай дзейнасці. Ужо тады стала зразумела, што зарабляць грошы могуць толькі «свае», а астатнім рабіліся шматлікія перашкоды.

Пасля пры непасрэдным удзеле «Бацькаўшчыны» была створана грамадская арганізацыя «Міжнародны дабрачынны фонд імя крыжа Ефрасінні Полацкай», дзе Макоўская (на той момант яна скончыла Акадэмію менеджмента пры Саўміне РБ і атрымала яшчэ і юрыдычную адукацыю) стала загадчыкам юрыдычнага аддзела.

Потым абставіны скалаліся так, што Ганна Сурмач вымушана была прасіць палітычны прытулак у Чэхіі, і Алена вярнулася ў «Бацькаўшчыну» на пасаду выканаўчага дырэктара.

На трэцім і чацвёртым з'ездзе гэтага грамадскага аб'яднання яе абіралі Старшынёй Рады, а на пятым яна стала галоўным кіраўніком Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», змяніўшы Аляксея Марачкіна.

## «Прывадныя рамяні» палітычных партый

Гэтыя слова належаць Алене Макоўскай, але сама яна таксама ўзгадала лозунг часоў КПСС. Справа ў тым, што напярэдадні пятага з'езда беларусаў свету вядомы апазіцыйны палітык Аляксандр Казулін (да якога аўтар ставіцца з вялікай павагай) прапанаваў далучыцца да створанай ім новай структуры «Беларускі дом». Кіраўніцтва «Бацькаўшчыны» адмовілася, і гэта было, на мой погляд, правільным крокам.

> **Сёння «Бацькаўшчына» актыўна працуе з 25 беларускімі суполкамі ў розных дзяржавах свету. А ўсяго за межамі нашай краіны жывуць каля трох з паловай мільёнаў беларусаў**

Не вельмі люблю цытаты, але мы маем якраз той выпадак, калі пазіцыю чалавека лепш за ўсё паказаць праз яго словы. У той час у інтэрв'ю адной з газет Макоўская сказала: «Бацькаўшчына» не з'яўляецца палітычнай арганізацыяй. Сябры Згуртавання — людзі абсалютна розных палітычных поглядаў. Мы з павагай ставімся да іх меркаванняў. І не нам вырашаць, каго з палітыкаў ім падтрымліваць. З часоў заснавання «Бацькаўшчыны» кіраўніцтву арганізацыі забаранялася быць сябрам якой-небудзь партыі. Мы можам супрацоўнічаць і супрацоўнічаем з палітычнымі структурамі ў Беларусі па тых напрамках, што адпавядаюць нашаму статуту».

Зараз многія лічаць, што трэці сектар, выкарыстоўваючы моладзевы слэнг, больш «круты» за палітычныя партыі. Ацэньваючы дадзены аспект, Макоўская зыходзіць з таго, што палітычныя партыі ставяць перад сабой адну мэту — прыход да ўлады. На жаль, палітыка — сёння гэта тое, што нас падзяляе. А грамадскія арганізацыі (такія, як «Бацькаўшчыны») працуюць з абсалютна рознымі палітычнымі плынямі і імкнуцца, наадварот, аб'ядноўваць людзей. Трэба знайсці нейкі грунт, дзе не будзе канфрантацыі. Галоўнымі становяцца праблемы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і беларускай культуры.

Пяты з'езд Згуртавання беларусаў свету не ўсімі быў успрыняты адназначна. Той жа вядомы мастак Алесь Марачкін, які ўзначальваў «Бацькаўшчыну» да мінулага лета, параўноўваў яго з партыйным сходам часоў «застою». Мабыць, на гэта паўплывала тое, што на ім былі дзяржаўныя чыноўнікі, які займаюць высокія пасады і нават адзіны сёння беларускамоўны міністр.

Дарэчы, менавіта Марачкін публічна выказаў задавальненне работай Макоўскай. Абіралі яе на безальтэрнатыўнай аснове. І не таму, не знайшлося іншых вартых кандыдатур. Якраз наадварот. Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» з'яўляецца адной з самых моцных (больш за дзве тысячы сяброў) структур беларускага трэцяга сектару. Папросту многія з іх разумна палічылі Алену менавіта тым чалавекам, які можа забяспечыць не толькі прэстыж, але і працаздольнасць. Супраць кандыдатуры Макоўскай не прагаласаваў ні адзін з дэлегатаў пятага з'езду беларусаў свету, а ўстрымаліся толькі двое.

## Місія «Бацькаўшчыны»

Ці павінна арганізацыя супрацоўнічаць з уладай? Гэта пытанне выклікае шмат спрэчак. Адны катэгарычна супраць, другія з такой жа шчырасцю імкнуцца знайсці нейкія агульныя кропкі. Не стану ў гэтым пытанні займаць чыйсьці бок. Адзначу толькі, што не так даўно тая ж «Бацькаўшчына» ўжо амаль была сярод падпольных маргіналаў.

Васіль Быкаў, Радзім Гарэцкі, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Марачкін, Алена Макоўская. Я наўмысна зноў пералічыў усіх кіраўнікоў Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», каб яшчэ раз падкрэсліць, у якой славутай кампаніі аказалася гераіня гэтага нарыса. А гэта значыць — трэба працаваць на мяжы асабістых магчымасцей. Не хачу праводзіць нейкі лікбез і пералічваць усё, што зроблена і робіцца, бо для гэтага не хопіць цэлай газеты. Спыню вашу ўвагу толькі на двух момантах.

Калі казаць пра нейкую галоўную мэту, то гэта, безумоўна, нацыянальная ідэнтыфікацыя беларусаў за межамі нашай краіны. Сёння «Бацькаўшчына» актыўна працуе з 25 беларускімі суполкамі ў розных дзяржавах свету. А ўсяго за межамі нашай краіны жывуць каля трох з паловай мільёнаў беларусаў. Фактычна місія «Бацькаўшчыны» амаль цалкам складаецца з таго, каб быць своеасаблівым прадстаўніцтвам замежнай дыяспары ў Беларусі і дапамагаць беларусам адчуваць сябе беларусамі ў замежжы.

Праблема даволі сур'ёзная, і аднымі падручнікамі па беларускай мове або арганізацыяй нядзельных школ яе не вырашыць. Асабліва, калі ўлічыць тое, што асіміляцыя адбываецца даволі хуткім тэмпамі. Пра гэта даволі красамоўна сведчаць лічбы перапісаў насельніцтва ў розных краінах свету. Што б там хто ні казаў, але без пэўнай дзяржаўнай падтрымкі ў гэтай сферы разлічваць на нешта значнае — немагчыма. Таму перад Аленай Макоўскай заўсёды стаіць даволі складаная задача. З аднаго боку, не страціць тое, што зараз ёсць, з другога — не атрымаць абвінавачанні ў калабарацыянізме.

Як вядома, днямі споўніўся год самай паспяховай акцыі «Бацькаўшчыны» — агульнанацыянальнай культурніцкай кампаніі «Будзьма беларусамі!». Хаця юрыдычна яна і з'яўляецца адной з 11 структур, якія першапачаткова вырашылі аб'яднаць свае намаганні, усе добра разумеюць, хто тут лакаматыў. Дык вось, за 365 дзён было праведзена 947 розных мерапрыемстваў. Па два-тры кожны дзень!

Такую б працаздольнасць многім нашым мужчынам!

ВІЗІТ

# СМЯРОТНУЮ КАРУ МОЖНА АДМЯНІЦЬ

Вольга ХВОІН

**«Каб увесці мараторый на смяротную кару і адмяніць яе, не абавязкова праводзіць у Беларусі рэферэндум», — заявіў падчас свайго візіту ў Мінск кіраўнік генеральнага дырэктарата Савета Еўропы па дэмакратыі і палітычных пытаннях Жан-Луі Ларан.**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Кіраўнік генеральнага дырэктарата Савета Еўропы па дэмакратыі Жан-Луі Ларан

Нагадаю, што на летняй сесіі Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы было прынята рашэнне, што для вяртання Беларусі статусу спецыяльна запрошанай у Савет Еўропы наша дзяржава мусіць увесці мараторый і затым адмяніць смяротную кару. «Я спадзяюся, што Беларусі будзе вернуты статус спецыяльна запрошанай у Савеце Еўропы, але супрацоўніцтва ў тых ці іншых формах можа адбывацца і так, — падкрэсліў спадар Ларан. — Я не абяцаю, што ўсё будзе хутка і проста. Нам спатрэбіцца цярпенне, узаемаразуменне і цяжкая, актыўная праца. І мы ў Савеце Еўропы гатовыя ўзяць на сябе гэтую задачу. Я з'язджаю з Мінска са станоўчымі ўражаннямі, але ўсведамляю, што яшчэ мусіць быць зроблена».

Жан-Луі Ларан лічыць, што рэферэндум для мараторыя і адмены смяротнага пакарання ў Беларусі можна не праводзіць, дастаткова прыбраць адпаведныя артыкулы з Крымінальнага кодэкса: «Рашэнне аб адмене смяротнай кары можа быць прынята палітычнай воляй без уліку меркавання большасці. Для мяне гэта найперш пытанне маралі. Смяротная кара — гэта адзіная форма пакарання, якая не можа быць выпраўлена. Беларусь не павінна адмяняць смяротнае пакаранне дзеля інтарэсаў Страсбургу, а мусіць зрабіць гэта дзеля інтарэсаў краіны».

Кіраўнік генеральнага дырэктарата Савета Еўропы зазначыў, што яго візіт у Беларусь быў кароткім, але «вельмі інтэнсіўным». Жан-Луі Ларан меў сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімірам Макеем, міністрам замежных спраў Сяргеем Мартынавым. Па словах госця, асноўнай мэтай сустрэчы ў знешнепалітычным ведамстве было «пашырэнне кантактаў, а таксама абмеркаванне магчымага далучэння Беларусі да канвенцый і пагадненняў Савета Еўропы». «Мы склалі спіс канвенцый крымінальнага права, да якіх Беларусь хацела б далучыцца. Гэта будзе абмяркоўвацца ў наступным годзе», — паведаміў Ларан.

Госць адмовіўся ацэньваць прагрэс Беларусі ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі. «Я ніколі не стаўлю ацэнкі, не праводжу параўнанні нейкіх краін. Я ацэньваю, ідзем мы наперад ці назад. Важна, дзе мы былі, ёсць цяпер і будзем», — сказаў прадстаўнік Савета Еўропы. Ён зазначыў, што на працягу 13 гадоў Савет Еўропы прытрымліваўся палітыкі ізаляцыі Беларусі, і толькі цягам апошняга года назіраецца новая тэндэнцыя — пашырэнне кантактаў і дыялогу на розных узроўнях. Пра што ў тым ліку сведчаць і візіты ў Беларусь старшыняў камітэтаў Савета Еўропы — міністраў Іспаніі і Славеніі. «Доўгія гады ў Страсбургу вяліся дэбаты пра тое, ці зможа палітыка ізаляцыі прывесці да лепшых вынікаў, чым палітыка адкрытага дыялогу. Зараз відавочна, што гэтая палітыка не прывяла да добрых вынікаў», — падкрэсліў кіраўнік генеральнага дырэктарата Савета Еўропы па дэмакратыі і палітычных пытаннях Жан-Луі Ларан.

Паводле яго слоў, пасля дакладу прадстаўніка ПАСЕ Андрэа Рыгоні аб сітуацыі ў Беларусі і актыўнай працы кабінета міністраў Савета Еўропы перамог пункт погляду, што дыялог з Беларуссю неабходны. «Цяпер складана сказаць, ці зможа гэта новая палітыка прывесці да лепшых вынікаў. Яе паспяховасць мы зможам ацаніць пасля наступных выбараў», — адзначыў прадстаўнік Савета Еўропы. Таксама ён дадаў, што на ўсіх сустрэчах узнімалася пытанне пераследу актывістаў грамадзянскай супольнасці: «Спадзяюся, што на гэта будзе нейкая пазітыўная рэакцыя, бо пераслед па палітычных матывах непрымальны для дэмакратычнага грамадства».

Жан-Луі Ларан унікнуў адказу на пытанне пра падрабязнасці сустрэчы ў Адміністрацыі прэзідэнта, аднак заявіў, што даўно ведае яе цяперашняга кіраўніка Уладзіміра Макея і лічыць, што «Макей ведае, што трэба рабіць, каб Беларусь была ў Савеце Еўропы».

АПЫТАННЕ

# З КУПАЛАМ І ЗУБРОМ НА ЛЮДЗІ

Вольга ХВОІН

**Герб у адным шэрагу сімвалаў з зубром і буслам. Скарына і Машэраў побач у топ-лісце выбітных і вядомых дзеячаў. Самыя папулярныя спевакі — Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская. Такія высновы зрабілі эксперты Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (BISS) пасля апытання «Брэнды: гістарычная памяць, сімвалы і масавая культура».**


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Кі--раўнік BISS, палітолаг Віталь Сіліцкі

## Адкуль наш род?

Паводле слоў кіраўніка BISS Віталя Сіліцкага, даследаванне мела на мэце паказаць, хто такія беларусы — самастойная нацыя ці мікс, утвораны культурна-гістарычнымі акалічнасцямі. Асобным народам сябе назвалі 51,8% апытаных, трыадзінай нацыяй — 41,9%. Вытокі беларускай дзяржаўнасці 38 % рэспандэнтаў бачаць у Вялікім княстве Літоўскім, 18% капнулі яшчэ глыбей і назвалі сябе нашчадкамі Полацкага і Тураўскага княстваў, 12% — БССР. Беларусь як маладую дзяржаву, што бярэ свае пачаткі з найноўшай гісторыі часоў Лукашэнкі, асэнсоўваюць 9% апытаных. І амаль кожны пяты не змог вызначыцца, ад якіх часоў адлічваць станаўленне Беларусі. «Калі на пачатку 2000-х гадоў ВКЛ пачало вырывацца наперад БССР, то многія з культурных дзеячаў гэтаму не верылі. Цяпер можна гаварыць пра трывалы трэнд. То бок, усведамленне таго, што Беларусь не пачалася з кастрычніка 1917 года, — амаль што справа нацыянальнага кансенсусу», — рэзюмуе Сіліцкі.

## Імя Беларусі

Вынікі апытання паказваюць, што на званне «Імя Беларусі» прэтэндуюць дзеячы, праспекты імя якіх яшчэ нядаўна былі цэнтральнымі ў сталіцы: Францыск Скарына і Пётр Машэраў набралі 33% і 25% галасоў адпаведна. У гэтую ж кампанію патрапіў і Кастусь Каліноўскі — яго відным і вядомым дзеячам Беларусі лічаць 13% рэспандэнтаў.

А вось на пытанне пра тое, каму з вядомых беларусаў варта ўсталяваць помнік, адказы размеркаваліся ў наступным рангу: найбольш вартым помніка беларусы лічаць Пятра Машэрава, яго гатовыя ўшанаваць 9,4% апытаных. На другім месцы апынуўся пісьменнік Іван Шамякін — помнік яму не супраць усталяваць 5% рэспандэнтаў. Далей ідуць Ефрасіння Полацкая — 4% і Кастусь Каліноўскі — 2,9%. На пятым месцы — цяперашні кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка — увекавечыць яго ў бронзе хочуць 2,7% апытаных грамадзян. Воіны Вялікай Айчыннай вайны «набралі» 1,5% галасоў, Уладзімір Мулявін — 0,9, Васіль Быкаў — 0,6%. Астатніх вядомых беларусаў бачыць у скульптуры апытаныя не вельмі хочуць — яны атрымалі менш за паўпрацэнта.

## Паміж гербам і буслам

Думаеце, што сімвалам Беларусі з'яўляюцца чарка і шкварка? Не. Ідэалагічна падкаваныя рэспандэнты (а такіх набралася 21% і 20% адпаведна) назвалі сімвалам сінявокай афіцыйны герб і афіцыйны сцяг. Рамантыкаў куды менш: за зубра свой голас аддалі 12% апытаных, за бусла — 6,6%. Гурманы вырашылі, што сімвал Беларусі — бульба, і ніякі іншы прадукт (4%), а вось за Пагоню, якая мусіць рабіць пазнавальнай нашу дзяржаву ва ўсім свеце, свой голас аддалі толькі 2% апытаных.

Пацікавіліся сацыёлагі і тым, што слухаюць нашы суайчыннікі. Першае месца ў спісе самых папулярных выканаўцаў заняў дуэт Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча (каля 8%). Далей на музычным Алімпе знаходзяцца спявачкі Ірына Дарафеева і Алеся (па 7,5%). Але найбольш адказаў было з пазнакай «ніхто»: 38% рэспандэнтаў не здолелі назваць папулярнага айчыннага артыста. З беларускіх гуртоў найбольшай папулярнасцю яшчэ ад савецкіх часоў карыстаецца ансамбль «Песняры» (амаль 40%), на другім месцы — «Сябры» (18%), на трэцім — «Верасы» (8%). Калектывы «*Тяни-толкай*» «*J: Морс*», «*Ляпис Трубецкой*», *N.R.M.* не пераадолелі нават пяціпрацэнтнага парогу сімпатый.




Сацыёлагі сцвярджаюць, што, нягледзячы на 75% беларускай музыкі ў эфіры, у дзесятцы любімых выканаўцаў чацвёра — спевакі з савецкім часоў. Прыцягнутыя за вушы «зоркі» маюць нізкі рэйтынг, а статус беларускамоўнай альтэрнатывы — маргінальны. Разам з тым сярод музычных гуртоў назіраецца ўстойлівае дамінаванне савецкіх брэндаў.

У стане брэндавых пісьменнікаў усё прадказальна: лідзіруюць Якуб Колас і Янка Купала, за імі ідзе Васіль Быкаў, затым Іван Шамякін, і замыкае пяцёрку Уладзімір Караткевіч. А вось «кнігаю Беларусі» нечакана стаў раман Івана Мележа «Людзі на балоце», відаць, як сімвал нашай ментальнасці.

Сацыёлагі канстатуюць, што прастора сімвалаў у Беларусі незапоўненая. На многія пытанні блізу палова рэспандэнтаў не змаглі адказаць. Большасць «брэндаў» была сфармаваная яшчэ за савецкім часам, і мы імі дагэтуль карыстаемся, не прыдумаўшы сабе нічога новага, ці не здолеўшы падтрымаць «раскрутку» новых імёнаў і сімвалаў. Праўда, Віталь Сіліцкі аптымістычна сцвярджае, што хоць і паступова, але дэсаветызацыя светапогляду беларуса ўсё ж адбываецца.

Спецыяліст у рэкламе Юлія Ляшкевіч даволі крытычна ацэньвае званне брэнда, якое ў даследаванні атрымалі і Вітаўт, і Машэраў. «Калі мы будзем шчырыя, то большасць з гэтых пазіцый брэндам не з'яўляецца, — адзначае эксперт. — Брэнд — гэта тое, што прадаецца. Чалавек бачыць назву і гатовы набываць прадукт толькі па прычыне належнасці яго да гэтай сям'і. Калі мы хочам паглядзець на сучасны брэнд Беларусі, то трэба пайсці на стадыён Дынама і паглядзець на людзей, якія заплацілі за тое, каб папрысутнічаць на гульні футбольнай каманды БАТЭ. Астатняе дастаткова шэрае і няўцямнае. Што тычыцца асобаў, то ўсе яны «нежывыя» і занадта ідэальныя, каб займаць розумы людзей на ўзроўні брэнду і ўзору, на які хочацца арыентавацца».



ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# АЛЬТЭРНАТЫВА БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Вольга ХВОІН

**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Фантастычныя гісторыі».
**14.40** «Элен і хлопцы. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Правілы ўгону». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Камедыя па пятніцах»: «Маўчы у анучку». Вялікабрытанія, 2005г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**00.15** «Для тых, хто не спіць»: «Трывіяльнае чытво». ЗША, 1997г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Жансавет.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** «Іншыя». «Формула свабоды».
**11.10** Гаспадар.
**11.40** Мультсерыял «Доктар Дог» (Францыя). Заключныя серыі.
**12.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.35** «Жадаю ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**13.45** Свая музыка. Працяг.
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.35** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Усё аб бяспецы.
**17.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Ак Барс (Казань). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.20** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.15** Бітва экстрасэнсаў.
**23.25** «Пра мастацтва».
**23.55** Тэлепорт.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Мой срэбны шар. Сяргей Піліпаў». Вядучы - Віталь Вульф.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Восеньскі дэтэктыў».
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Пакой смеху».
**15.20** «Паўночны вецер». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганская страсць». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Юбілейны вечар Ігара Крутога.
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** Сучаснасць кіно. «Бацька». Расія, 2007 г.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.35** «Кухары і кухцікі».
**09.05** «Масква - Ялта - Транзіт».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.15** «Галоўны герой прадстаўляе».
**12.05** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**12.25** «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенкі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**19.55** Прэм'ера. «НТБ-шнікі».
**21.00** Прэм'ера. «Суперстар» прадстаўляе: «Валеры Лявонцьеў. Кніга лёсу».
**23.15** Драма «Авіятар».

EUROSPORT

**09.35** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Стамбул (Турцыя). Дзень 1.
**10.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Альтэнберг (Германія).
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск/камбінацыя. (Францыя).
**12.15** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Спрынт. Хохфільцэн (Аўстрыя).
**13.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). 1/4 фіналу.
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Спрынт. Хохфільцен (Аўстрыя).
**16.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам/камбінацыя. (Францыя).
**17.15** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**18.30** Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак свету. HS 131. Трандхейм (Нарвегія).
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.15** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Стамбул (Турцыя). Дзень 2.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**00.15** Экстрэмальныя віды спорту. Free Ride Spirit.
**00.30** Керлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 1/2 фіналу. Абердзін (Вялікабрытанія).
**01.30** Керлінг. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/2 фіналу. Абердзін (Вялікабрытанія).

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.15** «Грыф: звышсакрэтна» (Top secret), дак. фільм, 2007 г., Германія: 3 серыя, «Выпрабаванне глабалізацыяй».
**20.05** Невядомая Беларусь: «Генерал няскончанай вайны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь, ч. 1. Стужка пра першага генерала БНР Станіслава Булак-Балаховіча.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Смерць як луста хлеба», маст. фільм, рэж. Казімеж Куц, 1994 г., Польшча.
**23.15** Аб'ектыў.

## 12 СНЕЖНЯ, СУБОТА

**06.55** Дакументальна-пазнавальны серыял «Афрыка. Магічны кантынент».
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Тэлесерыял «Вясковая камедыя» (Расія). Заключная серыя.
**10.35** «Шпілька». Праграма для жанчын.
**11.10** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE» з Дзянісам Дудзінскім і Вольгай Рыжыкавай.
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Дэтэктыў «Два квіткa на дзённы сеанс» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.20** Алімпійскі часопіс.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Вакол планеты».
**16.10** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**16.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.40** Відэафільм АТН «Напевы Гарадзенскага краю» цыкла «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Прэм'ера. Драма «Жыццё знянацку» (Расія).
**23.30** «Уласнай персонай».

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Хто ў хаце гаспадар?». 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Не абпаліся на малацэ».
**12.10** «Мой радавод. Дзмітрый Харац'ян».
**13.05** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.35** «Кінаметры вайны». «Праўда падзямелляў. Вуліца малодшага сына».
**14.10** «Вуліца малодшага сына». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя неверагоднасці. «Пустэльнікі».
**17.05** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**18.00** «Адзін супраць усіх».
**19.00** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.35** «Ледніковы перыяд».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Працяг.
**23.40** «Пражэктарперісхілтан».
**00.15** «Што? Дзе? Калі?».

**07.15** «Анфас».
**07.30** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**08.20** «Сямейнае кіно»: Андрэй Філімонаў і Тацццяна Чарнова ў фільме «Пецька у космасе». СССР, 1972г.
**09.30** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Ефрэмавым.
**10.00** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**10.55** «Мінск і мінчукі».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.05** «Ваенная таямніца» з Ігарам Пракапенкам.
**14.50** «Залатая калекцыя»:«Наш амерыканскі Бора». Расія, 1992г.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** Агляд міжнароднага шоу-бізнэсу.
**17.20** «Top Gear. Руская версія».
**18.10** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма». Фільм дзясяты «На карце свету».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** «Сусветны блокбастар»: «Майкл Клейтан». ЗША, 2007г.
**23.45** «Нефармат»: «Чэ: аргентынец». ЗША-Францыя-Іспанія, 2008г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**02.40** «Сімпсаны». Мультсерыял.

**07.45** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.45** Тэлепорт.
**09.10** Нашы тэсты.
**09.45** Жансавет.
**10.25** Свая кампанія.
**11.15** «Лабірынты гісторыі беларускіх яўрэяў». Частка першая.
**11.45** «Страсці па культуры» з Генадзем Давыдзько.
**12.25** Гараджане.
**12.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.40** Фантастычны серыял «Эўрыка» (ЗША).
**14.45** Жаночая ліга.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.00** Прыгодніцкі фільм (Германія-ЗША-Вялікабрытанія).
**17.50** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прамая трансляцыя.
**21.25** Моладзевая камедыя «Зяць» (ЗША).
**23.20** Жывы гук.
**00.05** Казанова.

РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.10** Юбілейны вечар Ігара Крутога.
**09.45** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**10.20** «Суботнік».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Формула ўлады». Герхард Шродэр. Пасляслоўе.
**11.50** «Відавочнае-неверагоднае».
**12.25** «Бацька». Расія, 2007 г.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Драма Івана Броўкіна». Дакументальны фільм.
**15.15** Прэм'ера. «Вялікая сям'я». «Гарадок».
**17.00** «Новая хваля - 2009».
**19.00** Весткі у суботу.
**19.40** «Гарадок».
**20.15** Прэм'ера. «Гувернантка». Расія, 2009 г.
**22.20** «Дзевяць прыкмет здрады». Расія, 2008 г.
**00.10** «Аповесць непагашанага месяца».
**01.35** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд». Лідзія і Валянцін Івановы.
**14.10** Меладрама «Мядзведжы пацалунак».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на дасследаванне».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00** Прэм'ера. Фільм жахаў «Імга».
**01.10** Трылер «Паркоўка».

EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**10.00** Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. (Швецыя). Спроба 1.
**11.45** Зімовыя віды спорту. Горныя лыжы. Ліндсей Вонн (ЗША).
**12.00** Керлінг. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Абердзін (Вялікабрытанія). Фінал.
**13.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу. Хохфільцен (Аўстрыя).
**13.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. (Швецыя). Спроба 2.
**14.30** Керлінг. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Абердзін (Вялікабрытанія). Фінал.
**15.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу. Хохфільцен (Аўстрыя).
**16.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 15 км вольным стылем. Давос (Швейцарыя).
**16.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).
**18.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**20.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Стамбул (Турцыя). Дзень 3.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). 1/2 фіналу.
**00.00** Керлінг. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Абердзін (Вялікабрытанія). Фінал.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.10** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.20** Героі не нашага часу: Сяргей Картэс: Аўтаномія асобы.
**19.35** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Спадар забойства», маст. фільм, рэж. Дзік Лоўры, 1998 г., ЗША.
**22.40** Аб'ектыў.

## 13 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.45** Фантастычная казка «Ліловы шар» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. «Дрэнны добры чалавек» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Беларускі спорт. Паўналецце».
**15.55** Гістарычны баявік «Аляксандр. Неўская бітва» (Расія).
**18.05** Суперлато.
**19.15** «OFF STAGE LIFE».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Ксенія Сабчак».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**23.40** Вострасюжэтная моладзевая камедыя «Экстрэмальнае спатканне» (ЗША).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Хто ў хаце гаспадар?». 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** АНТ прадстаўляе: «Песні Перамогі». «Свая вайна Булата. Тут птушкі не спяваюць».
**13.30** Прафесійны бокс. Віталь Клічко (Украіна) - Кевін Джонсан (ЗША).
**15.00** «Вялікая розніца».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Аляксей Ягудзін. «Мне вельмі пашанцавала з Таццянай».
**17.25** «Я кахаю цябе, жыццё!» Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Здабытак Рэспублікі».
**01.10** Прэм'ера. «Таямніцы смерці».

### СТВ

**07.00** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**07.50** «Кіно»: «Маўчы у анучку». Вялікабрытанія, 2005г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Прыватныя гісторыі».
**14.55** «Залатая калекцыя»: «Крымінальны квартэт». СССР, 1989 г.



**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** «Фільм тыдня»: «Памежны горад». ЗША, 2006г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.45** «Арт-хаўс»: фільм рэжысёра Дэвіда Станіка «Амерыка супраць Джона Ленана». ЗША, 2006г.
**01.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**02.10** «Сімпсаны». Мультсерыял.

### ЛАД

**06.50** Благавест.
**07.20** Мір вашаму дому.
**07.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.00** Прыгодніцкі фільм (Германія-ЗША-Вялікабрытанія).
**09.30** Кінапробы.
**09.50** Школа рамонту.
**10.50** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**11.40** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.25** Бухта капітанаў.
**14.05** Фантастычны серыял «Эўрыка» (ЗША).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Рыга)-Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**19.15** Нашы тэсты.
**19.50** Экспедыцыя.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Рамантычная камедыя «Законы прывабнасці» (Вялікабрытанія-Ірландыя).
**22.40** Свая музыка. Працяг.
**23.10** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** Мультфільм.
**07.35** «Дзевяць прыкмет здрады». Расія, 2008 г.
**09.10** «Гувернантка». Расія, 2009 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.25** «Казачая застава».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Служкі д'ябла».
**16.00** Прэм'ера. Святочны канцэрт.
**17.45** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.40** Прэм'ера. «Лепшыя гады нашага жыцця».
**22.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** «Танга на два галасы».
**01.20** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.05** Меладрама «Мядзведжы пацалунак».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Змаганне за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Савецкія біяграфіі». Кацярына Фурцэва.
**14.10** Мікалай Спірыдонаў, Марыя Кузняцова ў драме «Італьянец».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на даследаванне».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «З жыцця капітана Чарняева».
**00.30** «Авіятары».

### EUROSPORT

**09.40** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. (Швецыя). Спроба 1.
**11.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. (Францыя). Спроба 1.
**12.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Эстафета. Хохфільцен (Аўстрыя).
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам. (Швецыя). Спроба 2.
**14.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Слалам-гігант. (Францыя). Спроба 2.
**15.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).
**16.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт вольным стылем. Давос (Швейцарыя).
**17.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. Стамбул (Турцыя). Дзень 4.
**19.00** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Эстафета. Хохфільцен (Аўстрыя).
**20.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**22.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Телфард (Вялікабрытанія). Фінал.
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. HS 205. (Чэхія).

### БЕЛСАТ tv

**19.00** «Аблавушак», мультсерыял
**19.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.30** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 9 серыя
**20.15** Форум (ток-шоу): «Беспрацоўе: хто вінаваты?»
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мачука, маст. фільм, рэж. Андрэс Вуд, 2004 г., Чылі–Іспанія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик
Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
www.novychas.org

КІНО

# ЦАР І ЦАРЫЦА

Іван БІЧ

**Грамадскасць Паўночнага Каўказа пратэстуе супраць трактоўкі вобразу царыцы Марыі Цямрукаўны ў нашумелым фільме Паўла Лунгіна «Цар».**




Рэжысёр Павел Лунгін справакаваў шмат крыку. Ён закрануў цэлы пласт вельмі супярэчлівых тэмаў расійскай гісторыі, якія актуальныя дасюль. У прыватнасці, рэжысёр, супрацьпастаўляючы вобразу Івана Жахлівага вобраз мітрапаліта Філіпа, відавочна паставіў пад сумнеў аўтарытэт улады як абсалюту. Таксама ў фільме яўна праходзіць паралель паміж апрычнінай і сталінскім тэрорам.

Таму нядзіўна, што дэбаты вакол фільма хутка выйшлі за межы спрэчак гісторыкаў і культуролагаў. «Цар» стаў прадметам палітычнай дыскусіі. Некалькі рускіх нацыяналістычных груповак і патрыятычных гісторыкаў звярнуліся з лістамі ў адміністрацыю Мядзведзева з заклікам забараніць пракат «Цара», прыраўнячы яго да парнаграфіі.

Вось фрагмент аднаго з такіх лістоў: «Яны (стваральнікі фільма) робяць на экране крывавую фантасмагорыю: вар'яцкі цар-параноік з вечна адкрытым ротам, крыважэрныя сабакі-апрычнікі… Рускі народ выглядае як дзікае крыважэрнае быдла. А між тым, цар Іван Жахлівы выклікаў і выклікае нянавісць ворагаў Расіі па адной прычыне: ён узвялічыў яе палітычную ролю ў свеце, яе эканамічную і ваенную магутнасць».

У прынцыпе, у Крамлі маглі асабліва не звяртаць увагі на чалабітныя ад такіх маргінальных груп, як Саюз праваслаўных харугваносцаў (СПХ), сябры якога праславіліся экзатычнымі акцыямі. Такімі, напрыклад, як спаленне кніг пра прыгоды Гары Потэра, якія, на іх думку, утрымліваюць «ерась», або пахаванне цацкі малпы, на труне якой напісана «Дарвінізм. Атэізм».

Аднак у дадатак фільм «Цар» стаў часткай складанага і вельмі балючага ў Расіі каўказскага пытання. Справа ў тым, што ў стужцы відавочна негатыўна выведзена асоба Марыі Цямрукаўны, жонкі Івана Жахлівага, этнічнай кабардзінкі.

Марыя Цямрукаўна, да хрышчэння Кучэней, — другая жонка Івана Жахлівага, дачка кабардзінскага князя Цямрука. Яны — Марыя і Іван — пабраліся шлюбам 20 ліпеня 1561 года. Адзінае іх дзіця — царэвіч Васіль — памёр ва ўзросце двух месяцаў у 1563 годзе. У 1569-м памерла і сама Марыя.

Да рэвалюцыі расійскія гісторыкі пісалі пра царыцу Марыю не надта прыхільна. Вось як характарызуе яе Мікалай Кастамараў: «Жаніцьба гэта не мела добрага ўплыву на Івана. Ёсць звесткі, што яна (Марыя) актыўна ўплывала на палітыку мужа ў перыяд 1561–1569 гадоў і, верагодна, выступала адным з ініцыятараў апрычніны. Сама новая царыца пакінула па сабе памяць злой жанчыны. Цар працягваў весці п'янае і распуснае жыццё і нават, як кажуць, аддаваўся распусце ненатуральнай з Фёдарам Басмановым».

Сучасныя гісторыкі больш асцярожна падыходзяць да ўчынкаў Марыі Цямрукаўны. «У некаторых гісторыкаў узнікае спакуса прыпісаць кабардзінскай прынцэсе лютасць нораваў. Быццам, падабалася ёй не толькі паляванне і «мядзведжыя забавы», але і катаванні з пакараннямі смерцю. Але ці можна лічыць, што норавы сярэднявечнага Каўказа моцна адрозніваліся ад расійскіх? Нават Еўропа XVI стагоддзя была ахоплена крывавым кашмарам рэлігійных войнаў», — піша адзін з іх.

У СССР вобраз каўказкай прынцэсы на троне асабліва нікога не цікавіў. Думаецца, праблема была ў асобе яе мужа, які не ўпісваўся ў каноны прагрэсіўнага манарха. Затое пасля перабудовы царыца Марыя стала адным з афіцыйных герояў не толькі Кабарды, але і ўсяго расійскага Паўночнага Каўказа. Справа ў тым, што ў часы сярэднявечча асабліва ніхто не разбіраў, дзе кабардзінцы, а дзе чэркесы або адыгейцы.

У гонар царыцы ўзведзены помнікі, названы вуліцы і плошчы. У кабардзінскіх газетах адзначаюць: «Так, менавіта кабардзінцы — прадстаўнікі аднаго з адыгейскіх плямёнаў — сталі першымі каўказцамі, якія прыйшлі на зямлю сталіцы Расіі. Насуперак спекуляцыям, шлюб гэты даследчыкі лічаць шчаслівым. Марыя ва ўсім актыўна садзейнічала мужу. І нават адыгрывала значную ролю ў выбудоўванні адносін з Крымам, бо знаходзілася ў родных сувязях і з татарскай шляхтай. Мяркуючы па ўсім, нягледзячы на асаблівы нораў Івана Жахлівага, гэты шлюб быў адносна спакойным. Таму развагі пра гвалтоўную смерць царыцы можна лічыць недарэчнымі».

Падчас святкаванняў 450-й гадавіны ўстанаўлення стасункаў паміж Расіяй і Кабардой два гады таму Марыю назвалі «сімвалам дыпламатычнага і выгоднага саюзу жыхароў Каўказу і рускіх».

І вось на экраны выходзіць фільм Лунгіна. Марыя Цямрукаўна выглядае ў ім абсалютна вартай свайго мужа — ненармальная, капрызная, дрэнна адукаваная жанчына. Акрамя ўсяго, яе мараль вельмі кульгае. Прыдворны блазан называе яе «вавілонскай блудніцай». Увогуле, Марыі як персанажу яшчэ пашанцавала. У першым варыянце сцэнару царыца павінна была біць сябе пугай, каб кампенсаваць мазахісцкія схільнасці. Праўда, у фінальным варыянце засталіся сцэны, дзе яна б'е іншых.

Кабардзінская грамадскасць не разумее, што адбываецца. Вось фрагмент посту аднаго з інтэрнэт-форумаў: «Ці ведаюць самі руськія, пра што распавядаюць? Павел Лунгін выяўляе яе як чачэнку-шахідку, якая абколатая псіхатропамі. Пацікавіўся б для пачатку, ці магла яна дазволіць сабе спаць голай, цалавацца, сядзець пры мужы і дарослых? Мова пра кабардзінскую дзяўчынку, княжну. Жах! Нас усіх пакрыўдзілі».

Не падабаецца грамадскасці і тое, што ролю Марыі даверылі татарскай актрысе Раміле Іскандэр.

Як вынік — кампанія супраць фільма «Цар». 4 лістапада выход стужкі на шырокі экран ператвараецца ў Кабардзе ў маніфестацыю пратэсту. Мясцовы друк з радасцю адзначыў, што ніводная фірма не пагадзілася рабіць рэкламу твору Лунгіна. У залі на 450 месцаў прысутнічала толькі 14 чалавек.

Цяжка прагназаваць, чым закончыцца дзіўная гісторыя вакол сярэднявечнай княжны, жонкі Івана Жахлівага. Пакуль афіцыёз крытыкуе вытворцаў карціны, сыходзячы з пазіцыі лаяльнасці Маскве. «Вось як, аказваецца, Лунгін бачыць саюз Расіі і Каўказа — як Саюз двух самадураў», — піша адна з газет.







## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Зыходзячы з таго факту, што галоўным ньюсмейкерам і спікерам створанага Мытнага саюза быў беларускі прэзідэнт, можна зрабіць выснову — менавіта ён больш за ўсё зацікаўлены як у яго стварэнні, так і ў інтэграцыі ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). Яшчэ свежыя ў памяці паведамленні СМІ пра тое, як напярэдадні сустрэчы Мінск патрабаваў адмены экспартных мытаў на расійскую нафту і аднолькавага кошту на энерганосьбіты. Невядома, ці атрымаў «Бацька ўсіх беларусаў» тое, што хацеў, — хутчэй за ўсё, мы даведаемся пра гэта ў будучыні. Калі не атрымаў — то Мінск вельмі хутка падасца ў іншы бок. Мы пачуем ужо не гарачае жаданне хуткай інтэграцыі, а больш традыцыйныя ў апошні час папрокі ў бок Масквы. Што ж тычыцца Украіны, то ўдзел нашай краіны ў падобных сітуатыўных аб'яднаннях будзе ёй толькі шкодзіць. Акрамя пустой і пафаснай рыторыкі, яны нічога не прынясуць — дамовіцца пра адраджэнне СССР ужо немагчыма.

**«Mobus» (Украіна)**

Гістарычная дамова пра стварэнне Мытнага саюза Расіі, Беларусі і Казахстана, падпісаная ў суботу лідэрамі трох дзяржаў, не ліквідавала фундаментальных супярэчнасцяў паміж краінамі-ўдзельніцамі. Інтарэсы Масквы і Мінску па-ранейшаму процілеглыя наконт паставак ключавых тавараў — нафты, газу, харчавання, аўтамабіляў і сельскагаспадарчай тэхнікі. Тым часам для Расіі ўдзел у новым саюзе, па меркаваннях экспертаў, азначае фактычную адмену раней дасягнутых дамоўленасцяў па ўмовах далучэння да Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА).

**«Независимая газета» (Расія)**

Пачынаючы з 2007 года Лукашэнка зрабіў шэраг крокаў, накіраваных на нармалізацыю адносін з Захадам, самымі вядомымі з якіх сталі шырокая амністыя (у тым ліку былога кандыдата ў прэзідэнты Казуліна) і спыненне практыкі масавых арыштаў апазіцыянераў. У адказ былі адмененыя санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў, а МВФ стаў даваць крэдыты. Аднак Лукашэнка так і не пусціў апазіцыю ў парламент і не прадэманстраваў гатоўнасці да сур'ёзных структурных рэформаў. Некаторыя прыкметы паказваюць, што перыяд раману з Захадам падыходзіць да заканчэння. Шырока вядомым фактам з'яўляюцца дрэнныя асабістыя адносіны Лукашэнкі і Пуціна. Таму рэсурс «сяброўства» тут таксама абмежаваны. Беларускія чыноўнікі і палітыкі кажуць: Лукашэнка сур'ёзна асцерагаецца, што яго атруцяць.

**«Особая линия» (Расія)**

У назіральнікаў адразу ж з'явілася шмат пытанняў. Як на гэта (Мытны саюз) глядзяць у самай СГА, наколькі расцягнецца працэс, і, галоўнае, як Расія і Беларусь збіраюцца ажыццяўляць такую інтэграцыю, калі нядаўна краіны былі ў стане «малочнай вайны». Нягледзячы на тое, што гандлёвай вайны зараз няма, агульны палітычны клімат у адносінах Масквы і Мінску амаль не змяніўся: праўда, на гэты раз Лукашэнка распісаўся ўсюды, дзе трэба. Можна колькі заўгодна пазначаць сваю крутасць і незалежнасць, але выхад на расійскі рынак неабходны беларускай эканоміцы як паветра. У эканоміцы ў Лукашэнка справы дрэнныя, а Захад яго гульні не прыняў.

**РБК (Расія)**

На саміце Мытнага саюзу Лукашэнка ўжо характарызаваў яго стварэнне як вельмі выгаднае. Аднак кіданні, мяркуючы па нервовым выглядзе і заявам правадыра Беларусі, нікуды не зніклі… У функцыянаванні Мытнага саюза могуць паўстаць праблемы. Цяпер падпішуць, увесну пачнуць дзяліць грошы — вось там паўстане праблема.

**«Московский Комсомолец» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ПОЛЬШЧА. КАМУНІСТЫ, ЗАМЕСТ ЗОРКІ МАЛЮЙЦЕ КОЛА




Арыгінальна адрэагаваў аўстрыйскі мастак і сябра мясцовай камуністычнай партыі Томас Рыхтэр на рашэнне ўладаў Польшчы забараніць выкарыстанне ў краіне камуністычнай сімволікі. Такі закон падпісаў на мінулым тыдні польскі прэзідэнт. Польшча, такім чынам, стала наступнай пасля Венгрыі, Эстоніі і Літвы краінай Усходняй Еўропы, дзе публічнае выкарыстанне такіх сімвалаў, як чырвоная зорка, серп і молат, цягне за сабою крымінальную адказнасць. Мастак прапанаваў камуністам краін, дзе камуністычныя сімвалы трапілі пад забарону, выкарыстоўваць чырвоны кружок або проста кропку падобнага колеру. «Камунізм застаецца сучасным. Кропка», — такімі словамі заканчваецца маніфест Рыхтэра. Застаецца адзначыць, што прапанаваны Рыхтэрам дызайн камуністычнага руху — белае поле плюс чырвонае кола, вельмі нагадвае сцяг Японіі.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### РАСІЯ. ЧЭРКЕСЫ ПАТРАБУЮЦЬ АСОБНУЮ РЭСПУБЛІКУ

Малады рух чэркесаў «Адыгэ Хасэ» правёў два мітынгі, патрабуючы адраджэння Чэркескай рэспублікі. Зараз чэркесы ўваходзяць у склад Карачаева-Чэркескай рэспублікі. Падстава патрабаваць асобнай адміністратыўнай адзінкі — «немагчымасць рэалізацыі этнасу ў Карачаева-Чэркесіі». Акцыя мела грамадскі рэзананс. У адным з аулаў на мітынг «Адыгэ Хасэ» сабралася больш за тысячу чалавек. Рэакцыя ўладаў была супярэчлівая. Яны пагражалі арганізатарам адміністратыўнай адказнасцю (мала таго, што мерапрыемства не было дазволеным, дык яшчэ адбывалася ў той час, калі ў рэспубліцы дзейнічаў рэжым каранціну супраць грыпу), аднак адначасова паабяцалі правесці сустрэчу з прадстаўнікамі чэркескай моладзі. Акрамя таго, улады заявілі, што не чэркесы, якіх у краі 11 працэнтаў, а карачаеўцы, якіх амаль 40 працэнтаў, церпяць ад таго, што жывуць побач з чэркесамі. Яны спасылаюцца на формулу падзелу міністэрскіх партфеляў. У рэспубліканскім урадзе кожны этнас мае роўную фракцыю. Але ў некаторых ведамствах колькасць чэркесаў дасягае 70 працэнтаў. Так ці інакш, у Маскве пакуль пратэсты чэркесаў ігнаруюць. Нагадаем, што Чэркеская рэспубліка, праўда, у статусе аўтаномнай акругі, сапраўды існавала ў складзе Карачаева-Чэркесіі з 1926 па 1944 гады. Пасля карачаеўцаў прызналі нацыяй ворагаў народа і саслалі ў Сібір, а пасля вяртання ў 1959 годзе Карачаева-Чэркесія зноў з'явілася на мапах СССР, праўда, чэркесаў пазбавілі статусу аўтаноміі. У 1991 годзе чэркесы паспрабавалі стварыць асобную рэспубліку, аднак Ельцын іх суверэнітэт не прызнаў.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ІСПАНІЯ. КАТАЛОНЦЫ ГАТОВЫЯ ІСЦІ ДА КАНЦА

26 лістапада 12 галоўных газет Каталоніі выйшлі з адным і тым жа рэдактарскім артыкулам. Артыкул называецца «Годнасць Каталоніі» і выступае за захаванне цяперашняга Статуту аўтаноміі Каталоніі (прыняты ў 2006 годзе). «Трэба нагадаць, што статут быў прыняты каталонскім і іспанскім парламентамі, на рэгіянальным рэферэндуме за яго галасавала большасць. Калі будзе патрэбна, мы знойдзем у сабе сілы зноў аб'яднацца і выступіць за інтарэсы грамадства», — адзначаецца ў тэксце. Прычынай для такой заявы стала рашэнне Кансерватыўнай народнай партыі аспрэчыць статус у Канстытуцыйным судзе. Кансерватары прапануюць выключыць з тэксту Статуту 46 пунктаў (усяго іх 120). Найбольш каталонцам не падабаецца намер правых выключыць пункт пра тое, што каталонцы — «нацыя». З улікам таго, што каталонскі Статут падтрымала кіруючая ў краіне партыя сацыялістаў, наўрад ці Канстытуцыйны суд будзе радыкальна карэктаваць тэкст закона. Між тым, каталонскія нацыяналісты гатовыя ісці да канца. 12 снежня ў якасці адказу на ўчынкі іспанскіх імперыялістаў у краі адбудзецца сімвалічны рэферэндум пра выхад Каталоніі са складу Іспаніі.

**Па матэрыялах «Publico» (Іспанія)**




▸ **НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ**

# РЭФЕРЭНДУМ НА АНДРЭЯ

**Алег ПЯТРОЎ**

**30 лістапада 2010 года ў Дзень Святога Андрэя можа пачацца працэс выхаду Шатландыі са складу Вялікабрытаніі.**



**Алекс Салманд**

Ідэя правядзення рэферэндуму была агучана два гады таму. На той момант шатландскія нацыяналісты знаходзіліся ў стане эйфарыі. Упершыню ў гісторыі вядучая Шатландская нацыянальная партыя (SNP) здолела сфармаваць кабінет міністраў.

Першае, што зрабілі новыя ўлады, абвясцілі дэбаты наконт пытання, як дабіцца поўнай самастойнасці ад Лондана. Дэбаты працягваліся 27 месяцаў. У панядзелак, 30 лістапада, Алекс Салманд, шатландскі прэм'ер і лідэр SNP, падвёў вынікі дыскусіі і прапанаваў публіцы справаздачу «Белыя паперы шатландскай незалежнасці».

Першы міністр краю Алекс Салманд дэкляраваў: «Выключна поўная незалежнасць дасць Шатландыі свабоду, неабходную для рэалізацыі свайго патэнцыялу ў якасці роўнага сябра міжнароднай супольнасці». Пры гэтым Салманд далёкі ад таго, каб патрабаваць надання Эдынбургу поўнай незалежнасці цяпер і зараз. Незалежнасць надыдзе пасля таго, як Шатландыя пройдзе некалькі фазаў. Вось яны:

***Devolution plus.*** Шатландскі парламент атрымае права самастойна збіраць падаткі, браць пазыкі за мяжой у таго ж Міжнароднага валютнага фонду, уводзіць мясцовыя падаткі.

***Devolution max.*** Шатландыя атрымлівае поўную фінансавую аўтаномію, уся сістэма падаткаў пераходзіць таксама пад кантроль Эдынбургу. Шатландскі ўрад становіцца ўласнікам прадпрыемстваў па здабычы газу ў Паўночным моры.

***Full independence.*** Шатландыя атрымлівае поўную незалежнасць як краіна — сябар Еўрасаюза. Яна таксама стварае свае ўласныя сілы абароны, МЗС.

Аднак дзеля таго, каб пачаць працэс пераходу да поўнай незалежнасці, Салманду неабходна згода нацыі. Ён мае намер атрымаць мандат на пачатак аддзялення ад Вялікабрытаніі на рэферэндуме, які прызначаны на наступны год. Галасаванне адбудзецца ў сімвалічны для шатландцаў Дзень Святога Андрэя, які лічыцца патронам горцаў.

Рэакцыя на ініцыятывы SNP нават у Шатландыі была дастаткова асцярожная. Справа ў тым, што залатыя часы нацыяналістычных ілюзій засталіся ў мінулым. Эканамічны крызіс паказаў, як цяжка эканомікам малых нацый змагацца з крызісам. Сярод ахвяр глабальнай рэцэсіі Ірландыя і Ісландыя — краіны, якім у прапагандзе SNP адводзілася ключавое месца. Іх досвед быў лепшым доказам таго, што малыя паўночныя нацыі могуць выжываць у цяперашняй сітуацыі. Пасля дэфолту ў Ісландыі ў міфы пра «кельцкіх тыграў» мала хто верыць.

Бізнес-супольнасць Шатландыі ўжо выказалася наконт прапаноў SNP. На думку прадпрымальнікаў, незалежная Шатландыя не здольная рэагаваць на эканамічныя выклікі глабалізацыі.

Ініцыятыва нацыяналістаў выклікала агульную негатыўную рэакцыю з боку ўсіх буйных партый. Яны дружна крытыкуюць ідэю з рэферэндумам, праўда, з розных пляцовак.

Так, для лейбарыстаў самае важнае — вярнуць сабе імідж галоўнай левай партыі ў Шатландыі, які перахапіла ў іх SNP. Партыя Гордана Браўна актыўна эксплуатуе лічбу — 12 мільёнаў. 12 мільёнаў фунтаў будзе каштаваць шатландцам арганізацыя і правядзенне плебісцыту. Грошы давядзецца браць з іншых бюджэтных артыкулаў. Так, з-за рэферэндуму ахова здароўя і сацыяльная служба не далічацца 1,5 мільёнаў фунтаў.

Лідэр мясцовых лейбарыстаў не можа знайсці сабе месца: «Тое, што людзям трэба зараз — працоўныя месцы і добрая эканоміка. А не «пыхлівы праект» Алекса Салманда. Тэма рэферэндуму, які быццам будзе праведзены за народныя грошы, можа дапамагчы ім рэабілітавацца ў вачах мясцовага электарату». Пры гэтым, што вельмі важна, лейбарысты не супраць пашырыць аўтаномны статус Шатландыі. У сваім нядаўнім выступе (тэкст якога пішацца прэм'ерам) каралева паабяцала шатландскаму парламенту новыя ўладныя кампетэнцыі.

Незвычайную пазіцыю занялі дастаткова ўплывовыя ў рэгіёне пост-трацкісты з Шатландскай сацыялістычнай партыі (SSP). Яны абедзвюма рукамі за незалежнасць, аднак выключна пры ўмове, што выхад са складу Вялікабрытаніі будзе значыць шырокія сацыяльныя рэформы на карысць бедных груп насельніцтва.

А вось кансерватары лічаць, што цяперашніх паўнамоцтваў у шатландскага парламента і так зашмат. Аднак паколькі Шатландыя традыцыйна галасуе за левых, торы зрабілі стаўку на англійскі нацыяналізм. Дэвід Камерун, лідэр партыі торы, паабяцаў, што ў выпадку перамогі на прызначаных на наступны чэрвень выбарах у парламент, правы дэпутатаў ад Шатландыі будуць паменшаныя. Яны не змогуць галасаваць па шэрагу пытанняў (адукацыя, медыцына). Тут ёсць логіка. Усе пытанні адукацыі і медыцыны ў Шатландыі вырашае мясцовы ўрад. Атрымліваецца, што галасуючы па гэтых пытаннях, шатландскія дэпутаты ў брытанскім парламенце прадстаўляюць невядома каго, ні за што не несучы адказнасць.

Нарэшце, ліберал-дэмакраты. Яны назвалі SSP «партыяй з вялікімі эга». На іх думку, сваімі авантурызмам нацыяналісты нанеслі ўдар па сістэме школьнай адукацыі. Лібералы плачуць, што малыя дзеткі ў пачатковых класах не атрымаюць нейкіх бонусаў.

Усе партыі, якія супрацьстаяць нацыяналістам Шатландыі, гуляюць без вялікай рызыкі. На цяперашні момант толькі 20 працэнтаў насельніцтва краю падтрымліваюць ідэю поўнай незалежнасці. Гэта дае апазіцыі шанцы зрабіць сабе добры піяр. І прымушае задумацца, ці патрэбны рэферэндум у такіх нязручных умовах. Тым больш, што, адпаведна экспертам, параза SNP на рэферэндуме папросту здымае пытанне шатландскай незалежнасці з павесткі дня як мінімум на 15–20 гадоў.

Да таго ж шатландскія нацыяналісты маюць меншасць у парламенце. Каб ідэя наконт рэферэндуму пачала рэалізоўвацца, SNP патрэбна яшчэ 18 дэпутацкіх галасоў. Дзе яны іх возьмуць — невядома. Галасаваць за праект гатовыя толькі два дэпутата ад Зялёных і адзін незалежны парламентарый. Але такі расклад пакідае тэму незалежнасці і далей актуальнай.

Першым ускосным тэстам на тое, як электарат паставіцца да ініцыятывы партыі Салманда, стануць датэрміновыя выбары ў парламент на адным з участкаў у Эдынбургу, прызначаных на пачатак снежня.



РЭЛІГІЯ

# РЭФЕРЭНДУМ У ШВЕЙЦАРЫІ: ВЫКЛЮЧНА ФАКТЫ

Алег НОВІКАЎ

**Па выніках усенароднага галасавання ў Швейцарыі забаронена будаваць мінарэты. Ісламскі свет пратэстуе. Еўропа думае, як замяць скандал. Прапануем падборку некаторых малавядомых і цікавых фактаў, якія дапамаглі б чытачу скласці больш аб'ектыўнае ўяўленне пра тое, што адбываецца.**



На цяперашні час у Швейцарыі існуюць усяго чатыры мячэці з мінарэтамі. У краіне пражываюць 400 тысяч мусульман (7 працэнтаў насельніцтва). На пачатак 1980-х гадоў мусульман у Швейцарыі было 0,9 працэнта. Увогуле, 24 працэнты грамадзян краіны — іншаземцы.

Ініцыятыва правядзення рэферэндуму належыць ультраправай Народнай партыі Швейцарыі (SVP). Першапачаткова SVP збіралася ініцыяваць рэферэндум супраць практыкі прынясення ў ахвяру жывёл падчас ісламскіх святаў. Аднак паколькі такая практыка характэрна і для вернікаў-іудзеяў, было вырашана аб'ектамі атакі абраць мінарэты. Калі верыць прапагандзе правых, мінарэты — гэта сімвал шарыяту, які несумяшчальны са швейцарскай дэмакратыяй, і гэта замінае мусульманам інтэгравацца ў грамадства.

Найбольшай падтрымкай ідэя SVP карысталася ў нямецкамоўных кантонах. У адным з іх быў пастаўлены рэкорд падтрымкі. Тут за прапанову прагаласавала 70 працэнтаў удзельнікаў апытання. Найбольш негатыўна праект Народнай партыі ўспрынялі ў франкамоўным кантоне Генф. У Генфе супраць забароны будаўніцтва мінарэтаў галасавала 60 працэнтаў. У вялікіх гарадах, дзе пражываюць 90 працэнтаў швейцарскіх мусульман, ініцыятыва цалкам правалілася. У трох з чатырох гарадоў, дзе ёсць мінарэты, грамадзяне прагаласавалі супраць прапановы правых.

Вялікую ролю ў агітацыйнай кампаніі за забарону будаўніцтва мінарэтаў адыграла кампутарная гульня «Атака мінарэтаў», што з'явілася ў інтэрнэце. Па правілах, гулец павінен перашкодзіць муле пабудаваць мінарэт. Праграма зроблена такім чынам, што прыпыніць будаўніцтва амаль не магчыма. Пасля чарговай паразы на экране з'яўляецца заклік вярнуцца ў рэчаіснасць, пайсці і прагаласаваць на рэферэндуме.

Кіраўніцтва SVP выступіла супраць ідэі стварэння еўрапейскага руху за забарону мінарэтаў, паколькі лічаць, што гэта можа садзейнічаць інтэграцыі Швейцарыі ў склад Еўропы, што парушыць прынцып нейтральнасці краіны.

Як піша нямецкае выданне «Tageszeitung», вялікае значэнне для вынікаў рэферэндуму мела пазіцыя жанчын, якія лічаць сябе феміністкамі і нават прыхільніцамі левых партый. Яны, як правіла, галасавалі супраць мінарэтаў, пратэстуючы такім чынам супраць унутранай культуры ісламскіх грамад, якую яны лічаць аўтарытарнай і агрэсіўнай. Пры гэтым на публіцы яны пабаяліся дэманстраваць свае погляды, каб не выставіць сябе ксенафобамі. Таму падчас апытанняў *exit pool* хлусілі і казалі, што не падтрымалі ідэю SVP. У выніку падману ў лужыну селі некалькі самых вядомых швейцарскіх сацыялагічных кантор, якія праводзілі апытанні на выхадзе з участкаў для галасавання. Па іх дадзеных, за праект SVP галасавалі толькі 37 працэнтаў. Па афіцыйных дадзеных — 57 працэнтаў.

Вялікую ролю ў прыцягванні цікавасці грамадскасці да ініцыятывы SVP зрабіў правакацыйны плакат. На ім выяўлены жанчына ў паранджы і мінарэты, які сваімі шпілямі разбураюць швейцарскую нацыянальную сімволіку. Рэклама такога кшталту выклікала адразу шок і незадавальненне. Некаторыя муніцыпалітэты выступілі за забарону плакатаў. Так, плакаты былі забароненыя ў горадзе Базель. Былі спробы падаць на аўтараў плакатаў у суд за распальванне нацыянальнай варожасці.

Ужо ў панядзелак, 1 снежня, калі сталі вядомыя вынікі рэферэндуму, мусульманскі сайт Umma.com змясціў заклік да байкоту швейцарскіх тавараў. У спіс трапілі шмат рэчаў, у тым ліку дарагія гадзіннікі Rolex, даступныя вельмі вузкай часткі спажыўцоў. Між тым, ужо зараз відавочна, што галоўнай ахвярай байкоту стане кампанія Nestle, якая вырабляе танныя і папулярныя кандытарскія вырабы. Адміністрацыя канцэрну апературна заявіла, што выступае за свабоду рэлігійных перакананняў.

Геерт Вілдэрс — правы папуліст з Нідэрландаў — каментуючы вынікі рэферэндуму ў Швейцарыі, заклікаў забараніць Каран, які, на яго думку, не лепшы за «Майн кампф».

Адно з вядучых выданняў расійскіх нацыяналістаў «Агенцтва палітычных навінаў» (АПН) у рамках рэакцыі на навіны з Альпаў заклікала да падзелу Расіі на 20 Швейцарый. Такім чынам, на думку аўтара праекта, можна будзе стварыць дэмакратычныя інстытуты, якія лепш абароняць рускі народ ад навалы чужынцаў. Аўтарытарная кіраваная дэмакратыя Пуціна—Мядведзева, на думку супрацоўнікаў АПН, не здольная абараніць нацыю, а толькі робіць выгляд барацьбы з эмігрантамі.

Некаторыя партыі Швейцарыі выступілі за забарону практыкі рэферэндумаў. Між тым, швейцарскую мадэль рэферэндуму ўхвалілі прыхільнікі Партыі піратаў, якія выступаюць за тое, каб усе грамадскія рашэнні прымаліся на рэферэндумах праз інтэрнэт.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВАЛЯНЦІН НАЛІВАЙЧАНКА



Старшыня Службы бяспекі Украіны (СБУ) напярэдадні Дня памяці ахвяр Галадамору, які адзначаецца ва Украіне напрыканцы лістапада, агучыў спіс асобаў, якія падазраюцца ў арганізацыі гэтага злачынства. Нагадаем, што, паводле афіцыйных украінскіх звестак, ахвярамі голаду, які быў арганізаваны штучна ў пачатку 1930-х гадоў, сталі 8–10 мільёнаў украінцаў. Усяго Налівайчанка назваў 136 асоб, адказных за голад. Сярод іх тагачасныя лідэры савецкай Украіны Станіслаў Касіёр, Павел Постышаў, а таксама крамлёўскія бонзы (Сталін, Молатаў і г.д.). Цяпер, па логіцы, справа па іх павінна быць перададзена ў суд. Аднак наўрад ці дойдзе да суда. Па-першае, спіс падазраваных у злачынстве далёка не поўны. У яго не трапілі прозвішчы людзей, нашчадкі якіх займаюць у цяперашняй Украіне вельмі высокія пасады. Падчас судовага працэсу тыя імёны так ці інакш будуць агучаны. Па-другое, Крымінальны кодэкс Украіны ясна гаворыць: крымінальная справа можа быць заведзена выключна супраць фізічна жывых асобаў. Між тым, СБУ замест таго, каб удакладніць гэтыя юрыдычныя недарэчнасці, развівае ініцыятыву. 1 снежня прадстаўнік службы заявіў: «У выпадку, калі Кампартыя Украіны (КПУ) працягне падкрэсліваць, што ёсць нашчадкам КПСС з маральнага і юрыдычнага пункту гледжання, яна павінна быць забаронена».

### РАБЕРТА КАСТЭЛІ



Віцэ-прэм'ер у кабінеце Сільвіа Берлусконі арыгінальна адрэагаваў на навіну са Швейцарыі, дзе ў выніку рэферэндуму забаранілі мінарэты. Сеньёр Кастэлі выступіў з прапановай вярнуць на італьянскі сцяг выяву крыжа. Крыж як элемент гербу каралеўскага дома прысутнічаў на італьянскім сцягу, пакуль Італія была манархія. Яе гербам быў чырвоны шчыт з белым крыжам. Пасля прыняцця рэспубліканскай канстытуцыі ў 1945 годзе італьянскі сцяг набыў вядомы нам выгляд: зялёная, белая і чырвоная палосы. Аднак Кастэлі лічыць, што дастаткова проста намаляваць на белай паласе чорны крыж. Ён перакананы, што такім чынам Італія дасць годны адказ пагрозе ісламізму. Аднак, на думку назіральнікаў, заявы Кастэлі звязаныя з нядаўнім рашэннем Страсбургскага суда па правах чалавека. Суддзі ў Страсбургу патрабавалі ад уладаў Італіі прыбраць са школьных устаноў распяцці на сценах, якія нібыта «парушаюць правы бацькоў вывучаць дзяцей у адпаведнасці з асабістымі перакананнямі», а таксама «парушаюць правы вучняў на свабоду веравызнання».

### ЯНУШ КОРВІН-МІККЕ



30 лістапада — за дзень да фармальнага пачатку дзеяння на тэрыторыі Польшчы Лісабонскай канстытуцыі ЕС — польскі нацыяналіст, сябра групоўкі «Роўнасць і права», спаліў сцяг Еўрасаюза. Акцыя мела месца ў Варшаве насупраць будынка універсітэта. Тлумачэнні Януша вельмі простыя: у выніку далучэння да Лісабонскай канстытуцыі Польшча губляе незалежнасць і перадае Брусэлю суверэнітэт. «Польскі сейм ператвараецца ў лакальны сеймік, усе рашэнні, прынятыя на еўрапейскім узроўні, атрымліваюць у Польшчы статус законаў», — паскардзіўся Корвін-Мікке. Праўда, сам еўрафоб быў вымушаны прызнаць, што абсалютная большасць палякаў не разумеюць якія антыеўрапейскія забабонаў. Канстытуцыя ЕС, што ўступіла ў сілу з 1 снежня, якую падпісала Варшава, пазбаўляе апошнюю права вета на такія важныя рашэнні ЕС, як пашырэнне Еўрасаюза, міжнародная палітыка, сацыяльная бяспека, падаткі, культура. Усяго 40 пунктаў.

ПЕРАКЛАД

# МАРМАЗЯЎР СУПРАЦЬ ЖАБАВОКА:

**Марыя МАРТЫСЕВІЧ**

Гэтай восенню дзякуючы «пэўным звесткам з пэўных крыніц» мне стала вядома, што напрыканцы 2009-га — у пачатку 2010 года аднячасова пабачаць свет дзве публікацыі, якія без перабольшання можна назваць канкурэнтнымі. Гаворка пра беларускія пераклады другой часткі сусветна вядомай «Алісіяны» — аповесці Льюіса Кэрала «Through the Looking-Glass, and What Alice Found There», напісанай у 1871 годзе. Лішне казаць, на колькі моваў свету і па колькі разоў гэты твор, поруч са знакамітай першай часткай, перакладаўся, колькі ілюстрацый было намалявана, колькі пастаўлена п’есаў, знята фільмаў і мультфільмаў. І вось — беспрэцэдэнтная хваля абеларушчвання! У часопісе «ARCHE» мае выйсці аповесць «Скрозь люстэрка, і што ўбачыла там Аліса» ў перакладзе Веры Бурлак. У той жа час выдавецтва «Логвінаў» рыхтуе да друку дзіцячае выданне Льюіса Кэрала, дзе да перакладу Макса Шчура першай кнігі «Алесіны прыгоды ў Дзівоснай краіне» далучыцца ягоны ж пераклад другой кнігі — «На тым баку люстэрка, і што там напаткала Алесю».

Але хто б з выдаўцоў не вырваўся на паўкорпусу наперад, абодва гэтыя пераклады не будуць першымі беларускімі «Залюстроўямі». У інтэрнэце па адрасе http://opatryck.livejournal.com ужо год як змешчаны яшчэ адзін пераклад другой часткі (асабіста мне ён падаўся аматарскім). Яго аўтар — трыццацігадовы жыхар Віцебску Дзяніс Мускі — музыка, аранжыроўшчык паводле прафесіі. Узяўся за пераклад «ад няма чаго рабіць» ды з вялікай любові да Кэрала. Аднёс пераклад другой часткі ў «Мастацкую літаратуру», дзе Юрась Пацюпа прапанаваў для

## «ПЕРАКЛАДЧЫК — ГЭТА АЛІСА»



Фота Віктара Жыбуля.

**Вера «Джэці» Бурлак — паэтка, перакладчыца, спявачка, перформерка. Нарадзілася ў 1977 годзе ў Кіеве. Выпускніца філфака БДУ. Кандыдат філалагічных навук (сфера даследавання — дзіцячая літаратура Срэбнага стагоддзя). Піша паэзію і прозу. Аўтарка некалькіх самвыдаўскіх зборнікаў, кнігі вершаў «За здаровы лад жыцця» (2003). З 1997 года з’яўляецца нязменным галоўным рэдактарам самвыдавецкага часопісу «Вясковыя могілкі». Перакладае паэзію і прозу з англійскай, рускай, украінскай моваў. Жыве ў Мінску.**

***— Чаму ты ўзялася за пераклад другой часткі знакамітага дыптыху, абмінуўшы першую? Ты не верыш у Краіну Дзіваў?***

— Першую казку на той момант (каля 2 гадоў таму) Максім Шчур пераклаў, а другую — яшчэ не. Андрэй Хадановіч (рэдактар перакладу — М. М.) прапанаваў: а ці не перакласці?.. Напраўду, сама б я за гэты пераклад не ўзялася, бо лічыла, што гэта для мяне як стокілаграмовая штанга для дзетсадаўца. У Краіну Дзіваў веру напоўніцу, цяпер мару зрабіць пераклад і першай казкі — для калекцыі. Але гэта таксама штанга, а я змянілася мала.

***— Што выклікала найбольшыя цяжкасці пры перакладзе? Якімі момантамі ты асабіста ганарышся?***

— Вельмі доўга я не магла адчуць стыль «празаічнай» часткі. Напэўна, таму і зацягнула з перакладам два гады. Потым, здаецца, нешта адчула, ці ўдала — хай вырашаць чытачы. Былі асобныя моманты з цалкам неперакладальнымі рэаліямі. Напрыклад, «англа саксонскі» ганец Белага Караля, які ўвесь час прымае «англа саксонскія позы». Для сучаснага беларускага чытача, не абазнанага ў побыце віктарыянскай Англіі, гэта незразумела. Кэрал тут пацвяліў вучоных-сучаснікаў — аматараў моднай на той час англа саксонскай даўніны. У каментарах да рускага перакладу «Алісы ў Залюстроўі» Наталлі Дэмуравай прыводзяць тлумачэнні Хэры Моргана Эйрза, які ў сваёй кнізе «падае некаторыя выявы англасаксаў у розных строях і позах з англасаксонскага рукапісу, што захоўваецца ў Бадлеанскай бібліятэцы ў Оксфардзе, якімі, магчыма, карысталіся Кэрал і Тэніэл».

Я была разгубленая, думала рабіць спасылку з тлумачэннямі. Андрэй Хадановіч, рэдагуючы тэкст, прапанаваў варыянт: «першы англа саксонскі ганец з рысункамі» — па аналогіі з самарэкамендацыяй «Нашай нівы» — «першай беларускай газеты з рысункамі». І потым гэты ганец усё «рысуецца». Гэта, напэўна, быў адзіны тупік, з якога я зусім не магла выбрацца сама. Чым ганаруся? Мабыць, тым, што дарабіла гэту справу. А цягам працы скокамі самазахаплення суправаджалася кожная ўдалая знаходка. Запомніўся шосты раздзел, дзе Аліса вяслуе, а Авечка кажа: «Насядай!» (было неабходнае слова, якое б суадносілася і з вёсламі, і з фразеалагічна апрацаванымі хатнімі птушкамі, у маім выпадку — з наседкай). Ужо даўно пераклаўся верш «*Jabberwocky*», па-мойму, таксама нічога — ці гэта я так да яго прызвычаілася?

***— Не сакрэт, што Кэрал кпіць з пэўных момантаў англійскай гісторыі, далёкіх нашаму чытачу. Ці не было спакусы дадаць у пераклад крыху «беларушчынкі»?***

— Спакуса не толькі была, але нават была спатоленая. Прыклад з «англа саксонскімі ганцамі» даволі яскравы. Але і тут, і, спадзяюся, у іншых выпадках «беларушчынка» прысутнічае толькі як дадатковы сэнсавы складнік, намёк на знаёмае — пры спробе захаваць англійскі кампанент як асноўны. Чаму такі кампраміс? Бо твор будуць чытаць і дзеці, якім нецікава глядзець у спасылкі. «Беларусамі» сталі і Залюстэркавыя жамярынкі. Кэрал звязаў іх з добра знаёмымі дзецям рэчамі: драўляным конікам-гушкалкай, каляднай гульнёй у «*Snap-dragon*» і г.д. Пры перакладзе трэба было захоўваць не толькі сэнсавыя складнікі, але і прынцып словаў-партманэ, якія маюць агульную фанетычную або словаўтваральную частку (тут можна казаць пра нейкую «частковую» амафармію) і «зрастаюцца» ёю. У перакладзе даводзілася зноў шукаць кампрамісныя варыянты. «*Snap-dragon*», «*Dragon-fly*» і «*Snap-Dragon-fly*». Страказа (*Dragon-fly*) — жамярыца, *Snap-dragon* — рэалія, звязаная з Калядамі. Гэтыя кампаненты сэнсу (жамярыца і свята) я вырашыла захаваць, плюс «вогненную галаву» істоты, якая потым абгульваецца ў тэксце. Атрымалася «Зялёная Сёмуха» (з «зялёнай мухі»). Свята беларускае, але, па-мойму, гэта лепш, чым зноска на паўстаронкі з тлумачэннем, што такое *Snap-dragon*.

Нарэшце, ужо згаданы верш «*Jabberwocky*» таксама атрымаў беларускай крыві ў вены праз фанетыку і словаўтварэнне. Кэрал пісаў яго як напаўпарадыйную імітацыю архаічнага англасаксонскага тэксту. Па-беларуску была непазбежнай адсылка да нейкай калі не беларускай архаікі, то да вытокаў самой мовы, зразуметай як нацыянальны міф. Я вырашыла не цытаваць, а імітаваць архаіку, зрабіўшы ўрачыстай фанетыку. Плюс улюбёныя кэралаўскія «словы-партманэ». Усё разам — урачыстая балада з абсурдова-камічным паслясмакам. І калі спараджальнай стыхіяй робіцца беларуская мова, што застаецца *Jabberwock’у*? Толькі стаць беларусам.

***— «Скрозь люстэрка...» — дзіцячы твор?..***

— Шматадрасны. Падзяляю гэтую думку. Сама я прачытала гэту казку, у расійскім перакладзе Дэмуравай, недзе ў 12 гадоў. Чытала, старанна атрымліваючы задавальненне. Усё ж, пры ўсіх безумоўных вартасцях, у гэтым перакладзе амаль няма свавольстваў, на якія так здатны Кэрал і якія так любяць дзеці (праўда, вельмі інтэлігентных, прыстойных, культурных свавольстваў). Да таго ж, уражанне ад «Алісы ў Краіне Дзіваў» на плытцы, вынесенае з пяцігадовага ўзросту, пераважвала ўсе тэксты, нават з малюнкамі. Арыгінал прачытала цяпер. У захапленні. Не ведаю, ці зразумела б я ўсё, што цяпер, у дзяцінстве. Казка складаная: тут не толькі слоўныя гульні, неймаверныя пераўтварэнні і г.д., але і лірызм, якога я, напэўна, не заўважыла б.

***— А твой пераклад?***

— Я хацела б, каб яго маглі чытаць і дзеці. І каб ім не было сумна. Але каб аднячасова не адбылося «перапісвання» казкі, каб Кэрал застаўся Кэралам. Цяпер праверым, ці атрымалася.

***— Якія героі Кэрала твае самыя любімыя? Чаму?***

— Напэўна, самы любімы з герояў Кэрала — сам Кэрал. Геніяльны дзівак, якога цікавіць тое, пра што іншыя нават падумаць не здольныя. І Белы Рыцар — ён таксама такі.

Яшчэ — усе кэралаўскія нахабнікі — Жаўтун-Баўтун, Гутата і Гуляля, Каралевы і іншыя, дый з першай казкі таксама. Усе агулам. Гэта вонкавы свет — варожы, які не лічыцца з табой, але яго можна змесці адной рукой — як калоду карт або кучку шахматных фігурак.

І, канешне ж, Аліса. Бо, перакладаючы, я быццам адчувала сябе ёю. Інакш нічога не атрымалася б. Трэба было сябе кімсьці адчуць. І я быццам распавядала сабе казку Кэрала ад імя Кэрала.

***— Дзівасвет ці Люстрасвет — дзе б ты хацела апынуцца?***

— Паўсюль! Як Аліса. Перакладчык — гэта, па-мойму, Аліса. Уваходзіць у іншасвет (бо хіба не іншасвет спараджэнне іншай свядомасці?), спрабуе, як можа, жыць па яго правілах — і робіцца каралевай. Жарт, але калі перакладчыку нецікавыя пісьменніцкія «іншасветы», як жа яму працаваць? Мне яны падабаюцца, і я не супраць наведаць які-небудзь яшчэ.

### МАРМАЗЯЎР

*Брылела… Слюткія джгуркі*
*Лацверна свердзілі ў наллі.*
*Мурнелі ў мэмзе бабукі*
*І снінкі-хатылі.*

*«Бяжы ад Мармазяўра, сын:*
*Кіпцісты ён, ікласты ён!*
*Ён горш, чым птах Дзюбдзюб і чым*
*Жахматы Гамазон!»*

*Але ў руцэ ўжо двостры меч*
*На вусціш ворагу звінеў.*
*Герой пад дрэвам Думдум прэч*
*Адкінуў сум і неў.*

*І пасярод вышэрных мар*
*Апёк яго агністы зрок.*
*Са свістам з лесу Мармазяўр*
*Вылётвае ўпрыскок.*

*І — раз! І — раз! І — бах! І — брамс!*
*І чыкільжыкнуў двостры меч!*
*Аёй! З варожай галавой*
*Герой кірзуе прэч!*

*«Ты Мармазяўра збіў і сцяў?*
*Ідзі ж, дзіця, у мой абдым!*
*Салоўная пара! Ура!» —*
*Пеў бацька, рады ў дым…*

*Брылела… Слюткія джгуркі*
*Лацверна свердзілі ў наллі.*
*Мурнелі ў мэмзе бабукі*

### З раздзелу «Гутата і Гуляля» («Tweedledum And Tweedledee»)

*Раз Гуляля і Гутата*
*распачалі вайнушку,*
*бо Гутата у Гуляля*
*раструшчыў бразгатушку.*

*Але груган зляцеў з гары —*
*і каркнуў ім па карку!*
*І з жаху гора-змагары*
*забыліся на сварку!*

### З раздзелу «Жаўтун-Баўтун» («Humpty Dumpty»)

*Жаўтун-Баўтун сядзеў на муры.*
*Жаўтун-Баўтун зваліўся згары.*
*І ўся Каралеўская конніца,*
*і ўсе ваяры Караля*
*Ніяк не маглі Жаўтуна-Баўтуна*
*сабраць па кавалку пасля!*

### З раздзелу «Леў і Андарог» («The Lion and the Unicorn»)

*Леў з Аднарогам утрапёна сышліся*
*біцца за карону.*
*Леў Аднарога калаціў, нягледзячы*
*на супраціў.*
*І злосна кажучы «курняў!»,*
*яго па горадзе ганяў.*
*І белы хлеб даваў ім хтосьці, і чорны*
*хтосьці, хтосьці ж — косці,*
*А хтосьці — сьлівавы пірог —*
*і бамсь абодвух за парог!*

**Пераклала Вера Бурлак**

# ЛЬЮІС КЭРАЛ ПА-БЕЛАРУСКУ

сіметрыі зрабіць першую частку, над якой («Аліса ў Цудакуце») таксама ідзе праца. Тлумачыць, што ў інтэрнэце змясціў адно чарнавік перакладу другой часткі «Алісы», які ў дадзены момант паляпшае. Ганарыцца тым, што яго пераклад верша «Жабавок» чыталі ля сценаў Крайст Чорч Коледжа ў Оксфардзе.

Вось жа, на дадзены момант у наяўнасці па-беларуску ёсць тры «залюстэркавыя» Алісы і адна «дзівосная»... Першая рэакцыя — святое абурэнне. Нівы перакладу знакавых твораў сусветнай культуры не араныя (Дзе Гамер? Дзе Мілтан?! Дзе Панятоўскі?!!) — а яны вожкаюцца з любіменькім — усё абы ўволю пакаламбурыць, прыкрыўшыся класікам, постмадэрністы клятыя! Але супакоіўшыся і прызнаўшы за літаратарамі права выбару, што і як перакладаць, можна заўважыць нечаканы парадокс: перакладаў другой, менш культавай часткі кэралаўскай «Алісы» па-беларуску ўтрая болей, чым перакладаў першай, культавай абсалютна. Для параўнання: у рускіх другая частка існуе ў шасці версіях, а першая мае больш за тузін перакладаў... Я вырашыла высветліць, ці мае цяга беларускіх творцаў да залюстэркавага свету містычны падтэкст, пагутарыўшы з Верай Бурлак і Максам Шчуром асабіста. Апроч таго, здабыўшы ўсім спектрам сродкаў — ад абаяння да шантажу — пірацкія версіі абодвух перакладаў, сутыкаю ілбамі перакладчыкаў, публікуючы розныя версіі ключавых вершаў другой часткі — па якіх зазвычай найяскравей бачна, хто і як даў сабе рады з фірмовым кэралаўскім абсурдам.

Увага: каб не траўмаваць пяшчотныя натуры нашых творцаў і не заблытваць іх, у гутарках ужываюцца тыя варыянты імёнаў ды назваў, якія вынайшаў кожны з іх дзеля найвышэйшай мэты абеларушчвання старой добрай *Alice*.

### ЖАБАВОКІ

*Упоўдне рысы барзюкі*
*Свярбяху а крыўляху,*
*Сычаша птах, і мертвакі*
*Ва горбех верашчаху.*

*«Хавайся, сыне, Жабавок,*
*Звышнедачалавек!*
*Час, дабы з піхваў ты валок*
*Жлухлівы крывасек!»*

*Узяўшы ў пясць вяшчарны меч,*
*Ваяр, змяюку зрэўшы,*
*Акі Баян, пачаўша цеч*
*Размысляю па дрэўцы.*

*Се распярэджан ён стаяў,*
*А тут не ў знакі — скок!*
*З дубровы сам сябе із'яў*
*Пачмурны Жабавок!*

*Іду на вы! Галоў далоў*
*Жалудны меч стрыгаша!*
*Страхот гатоў — і стрымгалоў*
*Дамоў асілак бяша.*

*«Дзе Жабавок? Убіен?*
*Падзі да рук мая!*
*О, жарсны дзень! О, гласны дзень!»*
*Зрадзіцель успяяў.*

*Упоўдне рысы барзюкі*
*Свярбяху а крыўляху,*
*Сычаша птах, і мертвакі*
*Ва горбех верашчаху.*

### З раздзелу «Цімтарам і Тамтарам» («Tweedledum And Tweedledee»)

*Раз Цімтарама Тамтарам*
*Гукаў на бой зацята,*
*Бо разламаў той напалам*
*Бразготку свайго брата.*

*Тут з неба рынуўся крумкач —*
*Зляякаліся героі*
*І пачалі ўцякаць наўскач,*
*Забыўшы аб двубоі.*

### З раздзелу «Шурык-Дурык» («Humpty Dumpty»)

*Шурык-Дурык сядзеў на муры,*
*Шурык-Дурык кульнуўся згары.*
*Каралеўскае пешае й конная рушанне*
*Ўзняць Шурыка-Дурыка ўсёй грамадою*
*не дужае.*

### З раздзелу «Леў і Андарог» («The Lion and the Unicorn»)

*Леў з Аднарогам вёў двубой*
*за княжую карону,*
*Леў Аднарога перамог і кінуўся*
*ў пагоню.*
*Паднеслі ім і соль, і хлеб*
*(разынкі клалі ў цеста),*
*Пасля чаго пад бубнаў гром*
*іх вытурылі з места.*

**Пераклаў Макс Шчур**

## «У АРЫГІНАЛЕ ГЕРАІНЮ ЗАВУЦЬ ЭЛІС»



Фота Сяргея Сматрычэнкі

**Макс Шчур — паэт, празаік і перакладчык. Нарадзіўся ў 1977 годзе ў Брэсце. У Мінску ў лінгвістычным універсітэце вывучаў іспанскую мову. З 1998 года — палітуцякач у Чэхіі. Аўтар п'есы «Смерць тырана» (Мінск, 1997), паэтычных зборнікаў «Амфітэатар» (Прага—Гданьск, 1999), «Ранні збор» (Стакгольм, 2006). За непублікаваны раман 600-старонкавага сатырычна-палітычнага рамана «Там, дзе нас няма» атрымаў прэмію Янкі Юхнаўца (2004). Заснавальнік інтэрнэт-часопісу www.niamiesta.se, у якім публікуе найперш уласныя тэксты і свае пераклады замежных аўтараў на беларускую. Перакладае з англійскай, іспанскай, чэшскай і іншых моваў. Паслядоўны перакладчык англійскай літаратуры абсурду: на сайце knihi.com публікаваўся яго пераклад «Кнігі бязглузду» Эдварда Ліра. Жыве пад Прагай.**

***— Усяго адзін пераклад «Дзівоснай краіны» на беларускую (твой) — і аж тры «Залюстроўі»! Як ты думаеш, чаму беларускага перакладчыка вабіць менавіта гэты твор?***

— У часе майго навучання ў Мінскім лінгвістычным універсітэце адзін з маіх землякоў-берасцейцаў пераклаў першую частку «Алесі» на беларускую ў якасці дыпломнай працы, таму існуе прынамсі яшчэ адзін пераклад. На жаль, я пра яго ўсяго толькі чуў — але так часта бывае з нашым культурным даробкам: ён папросту не даходзіць да адрасата. У іншым выпадку кніжку маглі б прачытаць на пару гадоў раней...

Я не ўспрымаю першую і другую часткі «Алесі» як розныя творы. Прынамсі, я перакладаў яго як адзін твор: выклікам самому сабе тады, у 2001 годзе, было зрабіць менавіта абедзве часткі. Тады ж я прапаноўваў надрукаваць твор цалкам, але выдаўцоў чамусьці вабіла менавіта і выключна першая. Праўда, я вельмі рады гэтаму і спадзяюся, што праз гэта другая частка будзе больш «кэралаўская» за першую — ужо таму, што на яе дапрацоўку ў мяне было непараўнальна больш часу.

***— Самае асноўнае пытанне да цябе — гэта, канешне, імя гераіні. Чаму Алеся? Хоць крыху абазнаны чытач, адкажа табе: адрасаткі абедзвюх частак — канкрэтныя англійскія Alices, што рэальна існавалі...***

— Ведаеце, вакол гэтай кнігі столькі міфаў... «Аліса», «Залюстроўе», ці Вінні «Пух» альбо «Пэпі» Доўгаяпанчоха — гэта ўсё вельмі прыгожыя вынаходніцтвы рускіх перакладчыкаў, і яны зрабілі слушна, узняўшы чужы матэрыял да такога ўзроўню асваення, што ніхто і не падумае пацікавіцца, а як там у арыгінале... Галоўнае, што Шэрлак Холмс — гэта Ліванаў, а Баярскі — Д'Артаньян. А ў арыгінале гераіню кніжкі Кэрала завуць, вядома, Эліс — імя, якое па-рускy перадаецца як Аліса, мае старагерманскае паходжанне і па-рознаму гучыць у розных еўрапейскіх мовах: Аліс, Алісья, Алічэ і г.д. Да нас яно магло прыйсці ці з усходу ў форме «Аліса», ці з захаду ў форме «Аліцыя».

Я мог бы доўга вагацца ў выбары «слушнага» імені для гэтага дзіцяці, калі б малады паэт Антон Тарас не падказаў мне простага і вельмі беларускага выйсця — «Алеся», з якім я адразу ж і цалкам пагадзіўся: вось, думаю, у такіх рэчах трэба прыслухоўвацца да патэнцыйнага чытача... Ніколі б не падумаў, што давядзецца потым столькі тлумачыць гэтую дэталь таму ж самаму чытачу, які чамусьці ставіцца да гэтага беларускага імені з такім падазорам... Мне гэта не зразумела. Па-чэшску, напрыклад, гераіню кнігі завуць Аленка... Чаму, ёсць жа Аліцэ? А вось таму: так пастанавіў перакладчык і такая склалася традыцыя. Для мяне дзіўна, што разрыў з рускай традыцыяй пераважваецца нашымі чытачамі так балюча. З гэтай жа прычыны назву фільма «*Pulp Fiction*» выдаўцы фактычна адмовіліся падаць у перакладзе, бо ён залішне адрознiваўся ад рускага — адсюль і ў нас з'явілася скалькаванае «Крымінальнае чытво».

***— Чаму гэта ўвогуле важна — абеларушчваць Кэралаўскія англійскія рэаліі?***

— Абеларушваць іх варта для таго, каб, парадаксальным чынам, падкрэсліць «англійскасць» тэксту і аўтара. Бо так, як іранізуе аўтар над нацыянальнымі звычкамі брытанцаў, беларусы з сабе не іранізуюць. Прыклад: у арыгінале першай часткі Кэрал распавядае падручнікавую гісторыю Вільгельма Заваёўніка і называе яе «найсушэйшай гісторыяй у свеце». Пры перакладзе я паспрабаваў быў замяніць яе на гісторыю неадбытай каранацыі Вітаўта, якую «спісаў» з «Кароткага нарысу гісторыі Беларусі» У. Ігнатоўскага — аднак рэдактар (Юрась Пацюпа — М. М.), відавочна, пабаяўся такой самаіроніі ды вярнуў у тэкст Вільгельма. Для беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак абодва гэтыя імёны — аднолькавы «цёмны лес», але ёсць адна дэталь: нарманская заваёва, як вядома, для англічан — гэта адмысловы «адпраўны» пункт гісторыі нацыі, і менавіта з залішняга акадэмічнага «піетэту» ў стаўленні да гісторыі і кпіць Кэрал. Каб гэта перадаць, варта было (на маю думку) прыблізіць рэаліі да ўласнай сітуацыі, але рэдактар палічыў інакш.

Вядома, падобнае абеларушванне непазбежна будзе ўспрымацца як залішне смелае, «адвольнае» развязанне, таму не варта ім злоўжываць без патрэбы. А патрэбаў можа быць некалькі: спрашчэнне (чужых імёнаў перадусім), тлумачэнне чужой рэаліі, якая ў нас адсутная (у падручніках па гісторыі дзецям не сустрэнецца сухі і доўгі аповед пра Вільгельма Заваёўніка, але пра Вітаўта — бадай, так), ці простая неабходнасць — у выпадку моўных гульняў. Калі я ўжо самой назвай стаў на шлях «беларусізацыі», то стараўся трымацца яго і ў тэксце, але пры найноўшай рэдактуры другой часткі мы з Юрасём Бушляковым (рэдактар, які рыхтуе «Алесяў» для выдавецтва «Логвінаў» — М. М.) імкнуліся пазбягаць «злоўжыванняў». Прыкладам «беларусізацыі» можа быць «Жабавокі» — але і ён будзе хутчэй за ўсё ўспрыняты бальшынёй як «злоўжыванне» ў кантэксце ведання рускага перакладу і няведання, як ствараўся арыгінал.

***— Што выклікала найбольшыя цяжкасці пры перакладзе? Якімі момантамі ты асабліва ганарышся?***

— Ну, вядома, самымі цяжкімі момантамі і ганаруся. Напрыклад, у англійскай мове адсутнічае двайное адмаўленне — каб захаваць сэнс цэлага абзацу, даводзілася шукаць такіх канструкцыяў павышуквацъ... Аўтар любіць ствараць двухсэнсавасць з дапамогай шматзначных словаў — напрыклад, «crab» азначае не толькі «краба», але (сярод мноства іншага) і «адхіленне ад курсу», а выраз «to catch a crab» апісвае яшчэ і спосаб веславання... Прыйшлося выдумляць рэчы кшталту «Спыні тут, дзяўчо, відно ж крабаў. — Спыні тут, дзе човен дно шкрабаў»... Хаця можна было адмовіцца ад перадачы слоўнай гульні, але менавіта такія сітуацыі для перакладчыка самыя цікавыя. Наколькі ўдала атрымалася іх развязаць — тут можа быць сто меркаванняў (іх заўжды больш, чым варыянтаў перакладу). Я ганаруся тым, што ўсё-ткі атрымалася.

***— Якія героі Кэрала твае самыя любімыя? Чаму?***

— Калі казаць пра першую «Алесю», то мне сімпатычны і Белы Трус, і абодва шаленцы, Заяц і Шапавал, якія выступаюць у абедзвюх частках, сімпатычны Чашырскі кот (я назваў яго Добрускім, ад Добрушу — прыклад яшчэ аднаго адкінутага «злоўжывання абеларушваннем»), Морж і Цясляр з другой часткі... Але самы любімы — бадай, Вусень з першай часткі (хаця ён спісаны з нейкага адстаўнога ваякі, я чамусьці зусім яго так не ўспрымаю)... Чаму? «Алеся абагаўляе зайца за тое, што заяц — зухаваты...» (цытата з Сёмага раздзела другой часткі «Леў і Аднарог» — М. М.) Відаць, таму, што ён лаканічны, у адрозненне ад мяне.

***— Дзівосная краіна — ці Люстраная краіна — дзе хацелася б апынуцца?***

— У абедзвюх адначасова, вядома. Хаця апынуцца — не праблема, праблема звычайна адтуль вярнуцца.

ЦІКАВА

# АДЗІНОКІЯ КОМІНЫ СТУДЗЁНКІ

Кастусь ТАРАСАЎ

**У Студзёнцы, на беразе Бярэзіны даўжынёю ў паўвярсты, пакутліва сустрэлі смерць у лістападзе 1912 года сорак тысяч французаў, а можа і больш. Гэта не адпавядала чаканням і планам Напалеона. Хто ж выпусціў перамогу са сваіх рук?**

## Пецярбургскі план

Аляксандр I склаў для фельдмаршала Кутузава і падпарадкаваных яму адміралаў Чычагава і графа Вітгенштэйна план па перакрыцці ўцёкаў французскага імператара.

Галоўная роля выпадала камандзіру 3-й арміі Чычагаву, якому трэба было ўзяць Нясвіж і Мінск і, заняўшы раку Бярэзіну, закрыць шлях адыходу французаў. Корпус Вітгенштэйна, наступаючы ад Полацка, павінен быў не дапусціць уцёкі Напалеона ў прастору паміж Бярэзінай і Дзвіной. А Галоўная армія пад камандаваннем Кутузава, выганяючы французаў ад Масквы, мусіла завяршыць акружэнне. Па плану, у гэтым рэгіёне павінна было знаходзіцца 160 тысяч рускіх войскаў.

Аднак паводле тлумачэнняў Чычагава склад яго войска выглядаў цалкам інакш:

«Я оставил берега Дуная с 35 тысячами человек. Присоединив к себе армию Тормасова (в которой согласно письму Барклая-де-Толли считалось 80 тысяч человек), я нашел в ней только 20 тысяч человек. Следуя на Минск и Борисов, я вынужден был разделить войска на две части, оставив часть Сакену и часть Эссену. Затем у меня осталось 25 тысяч человек. Битвы на дороге к Минску, взятие Борисова сократили армию на 5 тысяч человек.

С этим слабым войском я должен был бороться против Наполеона, который имел под ружьем более 40 тысяч, из коих 27 тысяч участвовали в сражении при переправе. А еще были толпы безоружных численностью в 45 тысяч человек».

Былі і папрокі на адрас Кутузава: «Я надеялся дать Кутузову средство прийти к Березине в одно время с Наполеоном, за которым он (как писал в своих реляциях) следовал по пятам. Мог ли я представить себе, что он останется на Днепре в 175 верстах позади, когда Наполеон подходил к Березине?»

Вось такім чынам замест 160 тысяч салдат, якія павінны былі б сустрэцца на Бярэзіне, да сярэдзіны лістапада толькі 25 тысяч арміі адмірала прыйшлі для затрымання Напалеона.

## Дзеянні Чычагава

Досвіткам 7 лістапада рускі генерал Ламберт узяў перадмостнае ўмацаванне, і раптоўнай атакай захапіў рэдуты. Палякі ўтрымлівалі толькі рэтраншэмент, з якога іх выбілі. Пяхота і кавалерыя Ламберта рушыла па мосце ў Барысаў.

Назаўтра ў горад прыбыў Чычагаў. Асляпленне ад першага поспеху на Бярэзіне стрымала адмірала ад таго, каб распачаць неабходныя меры па абароне Барысава.

«Я выслал отряд графа Палена на дорогу к Бобру, чтобы препятствовать отступлению неприятеля и войти в связь с графом Витгенштейном, — тлумачыў Чычагаў. — Но едва успел Пален отойти на 15 верст от Борисова, как наткнулся на колонну французской армии под началом маршала Удино».

Авангард Палена паказаў бяспечнасць, не выслаўшы выведкі, французы ж, выкарыстоўваючы мясцовасць, зламалі яго кавалерыю. Яна абвалілася на свае пяхотныя падмацаванні, і авангард паспешліва збег да Барысава. За імі непрыяцель уварваўся ў горад. Усё войскі Чычагава накіраваліся да моста, які хутка быў загружаны артылерыяй і абозамі. Адмірал спяшаўся перабрацца на правы бераг, і, каб ачысціць яму дарогу, з моста скідалі павозкі.

Здабыты з боем у французаў Барысаў не быў умацаваны нават лініяй траншэй, непрыяцель вярнуў сабе горад і нанёс арміі Чычагава страты. Адмірал быў ашаломлены настолькі, што страціў ініцыятыву. Не ведаючы, дзе Напалеон будзе пераправаўляцца, Чычагаў рассыпаў сваю армію па беразе Бярэзіны.



«На пераправа праз Беразіну». Мастак Ю. Фалат

## Дзеянні Вітгенштэйна

Ноч з 13 на 14 лістапада Напалеон правёў у Старым Барысаве ў доме Корсака. Менавіта тут каля Студзёнкі, дзе былі брады, ён вырашыў пераправўляцца. Амаль усё хаты вёскі былі разабраныя французскімі пантонерамі для пабудовы мастоў, адзіную хату, у якой начаваў Напалеон, раскідалі на дровы, як толькі імператар ступіў на наведзены да Брылей мост. Днём пачалася пераправа, а праз некалькі гадзін узвялі другі мост для перавозкі артылерыі і абозаў.

«Пока Наполеон оканчивал постройку мостов и продолжал переправлять войска, — тлумачыў Чычагаў, — мне более ничего не оставалось делать, как собирать все отряды, которые я расставил вдоль Березины».

Раніцай 16 лістапада, гэта значыць тыднем пазней арміі Чычагава, да Бярэзіны прыбыў граф Вітгенштэйн. Авангард яго падышоў да Студзёнкі, і 12 гармат, пастаўленых на ўзгорак, адкрылі агонь па пераправе.

Тысячы людзей кідаліся на масты, збіваючы іншых у ваду. Многія былі раздушаныя коламі і конскімі капытамі; зарадныя скрыні, падарваныя гранатамі, узляталі на паветра; коні, з перакуленымі перадкамі гармат, падалі з людзьмі ў раку.

Падчас бою Напалеон загадаў знішчыць масты, пакінуўшы на левым беразе вялізны абоз і натоўп. Тады пяхота, конніца, і ўсе, што трымаліся за арміяй — жанчыны і дзеці, — кінуліся на ўцалелы мост. Перайсці яго ім не ўдалася. Раніцай рака пакрылася лёдам, празрыстым, як шкло. Пад ім ва ўсю шырыню віднелася мноства людзей — салдат, жанчын з немаўлятамі.

## Узаемная непрыязнасць

Тыя камандуючыя, якім было загадана злучыцца каля Бярэзіны і не даць уцячы Напалеону, былі няздольныя да гэтага з прычыны непрыязнасці і зайздрасці адзін да аднаго. Вітгенштэйн не хацеў падпарадкавацца Чычагаву, які, у сваю чаргу, ненавідзеў Кутузаў за тое, што адмірал выявіў злоўжыванні князя падчас яго камандавання малдаўскай арміяй.

Адмірал Чычагаў растлумачыў паводзіны Вітгенштэйна так:

«Дав слово атаковать в одно время с нами, в 5 часов утра, он начал атаку только в 10 часов и не помешал маршалу Виктору стоять на позиции целый день. Он ввел в дело всего 14 тысяч, тогда как у него было 45 тысяч, все войска его стояли в отдалении без всякого дела. В свое оправдание он говорил, что «заставил Наполеона переправиться через Березину». Как мне кажется, ему вменено было в обязанности помешать этой переправе».

Асцярогі Напалеона быць насцігнутым Галоўнай арміяй да пераходу праз Бярэзіну былі марныя. Фельдмаршал Кутузаў не рушыў з месца з тым разлікам, што далёкі шлях, зіма, голад нават і без садзейнічання Галоўнай арміі, прывядуць французскае войска да разрухі. Так яно і атрымалася. Кутузаў быў супраць таго, каб пераследаваць Напалеона ў Еўропе, за імперскімі межамі, але вайна з ім працягнулася яшчэ два гады.

## Фельдмаршал Кутузаў

Рускі імператар пасля паразы руска-аўстрыйскіх армій у 1805 годзе пад Аўстэрліцам ставіўся да Кутузава негатыўна. Аляксандр I ледзь пазбег палону, ён скакаў некалькі гадзін сярод уцякаючага войска, быў стомлены, брудны, двое сутак не меняў бялізны, страціў багаж.

Але імператар усё ж даручыў Кутузаву камандаванне войскамі ў жніўні 1812 года. Аляксандр I так тлумачыў сваё рашэнне:

«В Петербурге я нашел всех за назначение главнокомандующим старика Кутузова — к этому взывали все. Так как я знаю Кутузова, то я противился сначала его назначению, но когда Ростопчин в своем письме... известил меня, что и в Москве все за Кутузова, то, не считая ни Барклая, ни Багратиона годными для главного начальства, и когда Барклай, как нарочно, делал глупость за глупостью под Смоленском, мне не осталось ничего иного, как уступить общему желанию. Я назначил Кутузова...»

Такой жа невысокай думкі трымаўся пра Кутузава яго паплечнік генерал Баграціён. Тры ў 6 жніўня, за дзесяць дзён да прыезду ў войска Кутузава, Баграціён па-прароцку напісаў Растопчыну ў Маскву:

«Хорош и сей гусь, который назван князем и вождем! Если особенного он повеления не имеет, чтобы наступать, я вас уверяю, что тоже приведет к вам Наполеона, как и Барклай... теперь пойдут у вождя нашего сплетни бабьи и интриги».

Вайна ў межах імперыі скончылася. У Вільні Аляксандр I прылюдна абняў Кутузава, уручыў яму Георгія першай ступені. Але ў гутарцы з прадстаўніком англійскага камандавання пры рускім войску генералам Вільсанам выказваўся:

«Мне известно, что фельдмаршал ничего не исполнил из того, что следовало сделать, не предпринял против неприятеля ничего такого, к чему бы он не был буквально вынужден обстоятельствами. Он побеждал всегда только против воли; он сыграл с нами тысячу и тысячу штук в турецком вкусе. Однако дворянство поддерживает его, и вообще настаивают на том, чтобы олицетворить в нем народную славу этой кампании. Отныне не подвергнут ее более опасности подобного предводительства».

1 студзеня 1813 года Аляксандр I аддаў загад войскам перайсці межы. У гэты час пасярэдзіне снежнага поля на руінах беларускай вёскі Студзёнка адзінока глядзелі на неба коміны.


АБ'ЯВА

**Шаноўнае спадарства!**

11 снежня ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Я. Купалы, 21) вас чакае

**вядомы беларускі бард і акцёр ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ**

з праграмай «Лепшае і новае».

Пачатак 19.00. Квіткі ад 15 000 да 20 000.

Даведкі: +375 29 649 08 88.






Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 795
Падпісана да друку 04.10.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.